

Праграма тэлебачання на наступны тыдзень

20 КАНАЛАЎ



Што чакае п'яных кіроўцаў?

СТАР 6



Чаму для вядомага кампазітара «не існуе натхнення»?

СТАР 8

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

9 ЛІСТАПАДА 2013 г. СУБОТА № 211 (27576) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

## НЕ ПРАВАЛІЦЬ МАДЭРНІЗАЦЫЮ ПРАЗ БЕЗГАСПАДАРЧАСЦЬ



Фота БЕЛТА.

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка наведаў ААТ «Барысаўдрэў». Гэта другі візіт кіраўніка дзяржавы на прадпрыемства. 30 лістапада 2012 года ўраду, канцэрну «Беллеспаперапрам», Мінскаму аблвыканкаму і кіраўніцтву гэтага прадпрыемства была пастаўлена задача да лістапада 2013 года завяршыць усе работы па мадэрнізацыі завода. Як яна вырашана сёння, Аляксандра Лукашэнку не задаволіла. Як вынік — шэраг жорсткіх кадравых і дысцыплінарных рашэнняў.**

Прыбыўшы на прадпрыемства, кіраўнік дзяржавы адразу адхіліўся ад падрыхтаванага маршруту наведвання, выявіўшы ў цэхах і на вытворчай тэрыторыі крайнюю ступень безгаспадарчасці. Нягледзячы на абяцанні, работы па мадэрнізацыі, часта неабгрунтавана, былі зацягнуты і, адпаведна, упустую патрачаны дзяржаўныя сродкі. Аляксандр Лукашэнка дэталёва азнаёміўся са станам прадпрыемства, наведаў вытворчыя памяшканні і выказаў крайнюю ступень незадаволенасці ўбачаным.

СТАР 2

## НА КРЫЛО!



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

### ЦЫТАТА ДНЯ



**Пётр ГРУШНІК, першы намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны:**

***«Сітуацыя на рынку працы на працягу апошніх гадоў застаецца стабільнай. Сёлета яна характарызуецца павелічэннем попыту на працоўную сілу (67,2 тыс. вакансій), зніжэннем колькасці беспрацоўных, якія стаяць на ўліку, да 20,9 тыс. чалавек. Узровень рэгіструемага беспрацоўя склаў 0,5% пры прагназуемым да канца года 1,5%. Разам з тым, на рынку працы назіраецца шэраг негатыўных тэндэнцый. Гэта павелічэнне вымушанай няпоўнай занятасці да 2,4% ад спісачнай колькасці работнікаў. Захоўваецца неадпаведнасць паміж попытам і прапановай рабочай сілы: 80% ад агульнай колькасці заяўленых наймальнікамі вакансій — па рабочых прафесіях. Асноўныя праблемы рынку працы сканцэнтраваны непасрэдна на мікраўзроўні, на канкрэтных прадпрыемствах».***

■ Заканатворчасць

## КРЫМІНАЛЬНЫ КОДЭКС ЧАКАЮЦЬ ПЕРАМЕНЫ



**У Палаце прадстаўнікоў да першага чытання рыхтуецца законапраект, які мае на ўвазе значныя змены ў Крымінальным, Крымінальна-працэсуальным, Крымінальна-выканаўчым кодэксах Беларусі. «За апошні час такія вялікія змены адбудуцца ўпершыню, — расказала журналістам старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па заканадаўстве Людміла МІХАЛЬКОВА. — Дакумент змяшчае больш за 100 артыкулаў. І гэта не таму, што кодэксы не дасканалыя. А таму, што раней нельга было прадугледзець тэхналогіі і спосабы, з дапамогай якіх здзяйсняюцца сучасныя злачынствы; змяніліся самі злачынствы, і людзі, якія іх здзяйсняюць. Гэты законапраект, да таго ж, разлічаны і на перспектыву. Нам важна пачуць як мага больш меркаванняў аб гэтым дакуменце».**

### Дасудовая дамова

Адной з галоўных навацый законапраекта з'яўляецца магчымасць заключэння дасудовага дагавора аб супрацоўніцтве з падазроным (абвінавачаным). Пры заключэнні такога пагаднення абвінавачаны абавязваецца садзейнічаць устанаўленню ісціны, выкрыванню саўдзельнікаў і кампенсаванню нанесенай шкоды. Пры выкананні гэтых умоў гарантуецца змяншэнне максімальнага тэрміну пакарання або прымяненне іншых мер крымінальнай адказнасці. Напрыклад, у выпадку групавога забойства да таго, хто заключыў са следствам дасудовае пагадненне, выкрыў усіх саўдзельнікаў, прызнаў сваю віну і раскаяўся, нельга будзе прымяняць смяротнае пакаранне альбо пажыццёвае пазбаўленне волі.

СТАР 2

## КІНО ЯК ПОШУК

**Кіно глядзяць усе. Яно можа быць розным — знятае ў розных жанрах, у розных аўтарскіх падыходах, з розным поглядам на свет, з любоўю да яго і пытаннямі: а куды ён крочыць?.. Кіно можна любіць па-рознаму: камусьці яно дапамагае прыемна правесці вольны час, хтосьці захапляцца любімымі артыстамі, некага кранае погляд на рэчаіснасць праз камеру, іншыя разам з аўтарамі-рэжысёрамі імкнуцца зразумець праз кіно жыццё і асэнсаваць сваё месца ў ім. Але кожны знаходзіць у кіно нешта для сябе. І шукае сваё кіно.**

Таму нам так дарагі кінафестываль, які адбываецца кожную восень вось ужо 20 гадоў. Мы шукаем у ім свае фільмы. І, можа быць, праз іх знаходзім сябе. Сёлета праграма была багатая на кіно, якое настройвала на роздум. Менавіта таму, што было скіравана на чалавека. На чалавечае жыццё ў розных праявах: у дробязях штодзённасці, у чалавечым супрацьстаянні, у сітуацыях, якія заклікалі да маральнага выбару, якія нагадвалі пра тое, якім павінен быць чалавек, варты кахання і павагі. У сітуацыях, якія нагадвалі пра тое, якім павінен быць чалавек, каб звацца чалавекам, і ў час розных спакус захаваць сябе. Гэты фестывальны тыдзень стаў цудоўным зваротам да пошукаў сэнсу жыцця. Інакш дзеля чаго ствараць мастацтва, калі не для таго, каб узвялічыць душу чалавека, якой ўсё больш і больш адмаўляюць у правах на існаванне, у адрозненне ад цела. У Мінску любяць кіно з душой. І не толькі гледачы. Ці то ў нас такая атмасфера, ці то людзі, якія жывуць у няпростых умовах, больш чуллівыя? Але ж нават падбор фільмаў працаваў на душу. І нават міжнароднае журы менавіта яе паставіла на галоўнае месца, калі меркаваць па выніках фестывалю, якія былі абвешчаны ўчора на ўрачыстым закрыцці.

Такім чынам, давайце адзначым для сябе тыя стужкі, якія былі адзначаны журы.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

*(Працяг тэмы на 6-й стар.)*

### Прызы XX Мінскага міжнароднага кінафестывалю «Лістапад» дасталіся:

**«Золата «Лістапада»** — «Іда» (рэж. Павел Паўлікоўскі, Польшча — Данія). Прысуджае журы асноўнага конкурсу ігравога кіно, старшыня — Аляксандр Зяльдовіч.

**«Серабро «Лістапада»** ў намінацыі «Фільм як з'ява мастацтва» — «Іда» (рэж. Павел Паўлікоўскі, Польшча — Данія). Прысуджае міжнароднае журы кінапрэсы, старшыня — Нэнсі Кондзі. Гэты ж фільм атрымаў прыз за аператарскую работу.

**«Бронза «Лістапада»** (прыз глядацкіх сімпатый) — «Па крузе» (рэж. Срдан Галубавіч, Сербія — Германія — Славенія — Харватыя — Францыя).

**«За лепшую рэжысуру»** адзначаны фільм «Дотык граху» (аўт. Цзя Чжанкэ»).

**Прыз «За найлепшы фільм конкурсу ігравога кіно «Маладосць на маршы»** імя народнага артыста СССР кінарэжысёра В. Турава — «У росквіце (Доўгія светлыя дні)» (рэж. Нана Эквіміташвілі і Сімон Грос, Грузія — Германія — Францыя).

**Спецыяльны дыплом міжнароднага журы кінапрэсы «За дэбют»** — «Дзіўная котка» (рэж. Рамон Цурхер, Германія).

**Прыз «За найлепшую жаночую ролю»** — Ліка Баблуані і Марыям Бакерыі за ролі ў фільме «У росквіце».

**Прыз «За найлепшую мужчынскую ролю»** — Фернанда Басілія за ролю ў фільме «Нямы» (рэж. Даніэль Вега і Дыега Вега, Перу — Францыя — Мексіка).

**Прыз «За найлепшую жаночую ролю другога плана»** — Агата Кулеша за ролю ў фільме «Іда» (рэж. Павел Паўлікоўскі, Польшча — Данія).

**Прыз «За найлепшую мужчынскую ролю другога плана»** — Сяргей Макавецкі за ролю ў фільме «Вечнае вяртанне» (рэж. Кіра Муратава, Украіна).

**Спецыяльны дыплом журы «За асаблівы погляд» фільму «Залатая клетка»** (рэж. Дыега Кемада-Дыес, Мексіка).

**Спецыяльны дыплом журы «За драматургічнае вырашэнне» фільму «Па крузе»** (рэж. Срдан Галубавіч, Сербія — Германія — Славенія — Харватыя — Францыя).

**Спецыяльны прыз Міждзяржаўнай тэлерадыёкампаніі «Мір» «Мова кіно — мова ўзаемпаразумення»** — «Музыка ваенная» (рэж. Галіна Адамовіч, Беларусь).

**Спецыяльны прыз радыё Unistar «За іранічны погляд на рэчаіснасць»** — «Любоўны гангстар» (рэж. Няйбоша Сліяпцэвіч, Харватыя — Германія — Румынія).

■ Надвор'е

## ЗАЛЬЕ ПАЎСЮДНА, А ПОТЫМ І ПАХАЛАДАЕ...

**У суботу тэрыторыя нашай краіны трапіць пад уплыў атмасферных франтоў, якія завіталі да нас з боку паўднёвага захаду Еўропы. Таму ў многіх раёнах чакаюцца дажджы, а максімальная тэмпература паветра ўдзень будзе плюс 8—13 градусаў, па поўдні Брэсцкай і Гомельскай абласцей — да 15 цяпла, паведаміла рэдакцыі спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга Фядотава.**



Прагназуецца, што ў нядзелю да нас завітае больш магутная зона вільготнасці. У сувязі з гэтым уначы месцамі, а раніцай і ўдзень амаль паўсюдна чакаюцца сапраўды моцныя дажджы. Тэмпература паветра на працягу сутак у нядзелю плюс 5—11 градусаў, па паўднёвым усходзе — 12—14 цяпла. У ноч на панядзелак па ўсёй тэрыторыі краіны пройдуць ападкі, у Віцебскай вобласці месцамі дажджы моцныя. Удзень невялікія дажджы чакаюцца толькі ў асобных раёнах. Раніцай і ўначы дзе-нідзе туман. Крыху пасвяжэе. У ноч на панядзелак будзе 2—8 цяпла, пры праясненнях падмарозіць да мінус 2 градусаў. Удзень — плюс 3—9, а па Гомельскай вобласці да 11 цяпла.

Паводле доўгатэрміновых прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у аўторак і сераду атмасферны ціск будзе павялічвацца, таму непрацяглыя дажджы чакаюцца толькі ў асобных раёнах Беларусі. Месцамі прагназуецца туман. Мінімальная тэмпература паветра ад мінус 2 да плюс 4 градусаў. Удзень у аўторак плюс 3—9, у сераду — 2—8 цяпла, на поўдні краіны — да плюс 10 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 09.11.2013 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 9250,00 | ▲ |
| Еўра | 12400,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 284,00 | ▼ |
| Укр. грыўня | 1127,70 | ▲ |

■ Курсавая розніца

## ЕЎРА ПРАЦЯГВАЕ ПАДЗЕННЕ

**Еўрапейскі Цэнтрабанк прыняў на гэтым тыдні рашэнне аб зніжэнні стаўкі рэфінансавання да 0,25% гадавых. Еўра «пайшоў» уніз.**

Як мы паведамлялі раней, інфляцыя ў еўразоне апошнім часам трымаецца на вельмі нізкім узроўні. Гэта выклікала зніжэнне вартасці «еўрапейца». Змяншэнне стаўкі рэфінансавання знізіла кошт валюты яшчэ больш. Аднак гэта, хутчэй за ўсё, часовая з'ява і еўра яшчэ пакажа сваю сілу.

У Беларусі еўрапейская валюта таксама патаннела — на 70 рублёў (мінус 0,6%) да 12400. Долар, у сваю чаргу, падаражэў — на 50 рублёў (плюс 0,5%) да 9250. Дарэчы, варта адзначыць, што на значэнне курсу нацыянальнай валюты ўплывае і ўзровень золатавалютных рэзерваў. Па выніках кастрычніка яны ў вызначэнні Спецыяльнага стандарту распаўсюджвання звестак МВФ скараціліся на 574,6 млн долараў ЗША і, паводле папярэдніх падлікаў, на 1 лістапада склалі 6,8131 млрд долараў у эквіваленце, паведаміла ўпраўленне інфармацыі і грамадскіх сувязяў Нацыянальнага банка. У нацыянальным вызначэнні аб'ём золатавалютных рэзерваў скараціўся на 559,3 млн долараў і на 1 лістапада склаў 7,4856 млрд. «Зніжэнне аб'ёму золатавалютных рэзерваў у асноўным абумоўлена пагашэннем у поўным аб'ёме знешніх і ўнутраных абавязацельстваў у замежнай валюце ўрада і Нацыянальнага банка, у тым ліку пікавымі выплатамі па крэдыце «стэнд-бай» Міжнароднага валютнага фонду», — тлумачаць сітуацыю ў Нацбанку.

Расійскі рубель патаннеў на 2 грашовыя адзінкі (мінус 0,7%) да 284.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.**

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### ЗША ПАЗБАЎЛЕНЫ ПРАВА ГОЛАСУ Ў ЮНЕСКА

ЗША пазбаўлены права голасу ў Арганізацыі Аб'яднаных Нацый па пытаннях адукацыі, навукі і культуры (ЮНЕСКА) за невыкананне тэрмінаў выплаты ўзносаў на ўтрыманне гэтай арганізацыі, перадаюць інфармагенцтвы. ЗША спынілі ўзносы ў бюджэт арганізацыі ў 2011 годзе ў знак пратэсту супраць прыняцця ў ЮНЕСКА Палесціны. Паколькі ўзносы ЗША складалі $80 млн у год, або 22% бюджэту ЮНЕСКА, арганізацыя апынулася на мяжы крызісу і прыняла рашэнне абмежаваць некаторыя праграмы, якія рэалізуюцца па ініцыятыве ЗША.

Страта права голасу азначае, што з гэтага часу ЗША не змогуць прымаць удзел у вырашэнні найважнейшых пытанняў у рамках арганізацыі.

### АЛІМПІЙСКІ АГОНЬ УПЕРШЫНЮ ПАТРАПІЎ У КОСМАС



Пілатуемы карабель «Саюз ТМА-11М» даставіў алімпійскі факел «Сочы-2014» на Міжнародную касмічную станцыю. На борце «Саюза» на МКС прыбыў інтэрнацыянальны экіпаж, у склад якога ўваходзяць касманаўт «Раскосмаса» Міхаіл Цюрын, астранаўт НАСА Рычард Мастракіа і астранаўт Японскага касмічнага агенцтва Каічы Ваката. Ім трэба будзе папрацаваць на арбіце больш за чатыры месяцы. На ракету і эмблему экіпажа таксама нанесена алімпійская сімволіка.

### НА ВЫБАРАХ У ТАДЖЫКІСТАНЕ ПЕРАМАГАЕ ДЗЕЮЧЫ ПРЭЗІДЭНТ РАХМОН

Дзеючы прэзідэнт Таджыкістана Эмамалі Рахмон, паводле папярэдніх даных, перамагае на выбарах кіраўніка дзяржавы з вынікам 83,6% ( 3 млн 23 тыс. галасоў выбаршчыкаў). Яўка выбаршчыкаў у дзень выбараў склала 86,6 %. Па словах прадстаўніка ЦВК, астатнія пяць кандыдатаў набралі менш чым па 5% галасоў.

ISSN 1990 - 763X

13211

9 771990 763008

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### ДЭПРЭСІЯ ПРЫЗНАНА АДНЫМ З САМЫХ НЕБЯСПЕЧНЫХ ЗАХВОРВАННЯЎ

Дэпрэсія — другая самая распаўсюджаная прычына недзеяздольнасці ў свеце пасля боляў у спіне, устанавілі эксперты, якія параўноўвалі даныя больш чым 200 хвароб і траўмаў. Паводле іх слоў, дэпрэсію неабходна расцэньваць як «сусветную праблему першага парадку». На жаль, толькі нямногія могуць атрымаць дапамогу спецыяліста ў сувязі з дэпрэсіяй. Акрамя таго, уздзеянне дэпрэсіі з пункту гледжання недзеяздольнасці ў рамках усяго насельніцтва вельмі адрозніваецца ў залежнасці ад краіны. Напрыклад, паказчыкі агульнай дэпрэсіі самыя высокія ў Афганістане, а самыя нізкія — у Японіі. Горш за ўсё сітуацыя ў краінах з нізкім і сярэднім прыбыткам. Лепш — у краінах з высокім прыбыткам. Сімптомы захворвання могуць быць хранічнымі або ўзнікаюць перыядычна. Часам чалавек губляе здольнасць спраўляцца з праблемамі паўсядзённага жыцця. А ў самай цяжкай форме дэпрэсія можа прывесці да самагубства.

## ШТО Б ВЫ ЗРАБІЛІ З АДНЫМ МІЛЬЯРДАМ РУБЛЁЎ ДЛЯ ПАТРЭБ АЙЧЫННАЙ КУЛЬТУРЫ?



**Алесь БЕЛЫ, гісторык, даследчык старадаўняй беларускай кухні:**

— Калі б я мог выбіраць, дык патраціў бы іх на падрыхтоўку і святкаванне 200-гадовага юбілею кампазітара Станіслава Манюшкі, які будзем адзначаць у 2019 годзе. На гэтыя сродкі можна было б паставіць яму годны помнік насупраць атэля «Еўропа», дзе сканцэнтравана найбольш яго памятных мясцін ці не ў цэлым свеце. Таксама варта б арганізаваць прыстойную экспазіцыю, прысвечаную Манюшку (напрыклад, у адным з пакояў Дома Ваньковічаў). І дафінансаваць пастаноўку ў Оперным тэатры «Страшнага Двара». Насамрэч культура патрабуе нашмат большых укладанняў, толькі пачынаць трэба са школьнага і сямейнага выхавання, каб сфарміраваць патрэбу ў ёй. Тады шмат што людзі будуць фінансаваць самі — і не толькі як мецэнаты, але нават проста як зацікаўленыя спажыўцы.



**Наталля КУЧЫНСКАЯ, член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па адукацыі, культуры і навуцы:**

— Зразумела, што ўсе патрэбы культуры такой сумай не задаволіць. Каб у мяне было больш сродкаў, я накіравала б іх на тры справы. Па-першае, на павышэнне заробкаў работнікам гэтай сферы — бібліятэкарам, артыстам, музейным супрацоўнікам. Па-другое, на рэалізацыю праекта «Музейны квартал у Мінску» па ідэі Уладзіміра Пракапцова, бо лічу, што стварэнне такога квартала магло б мець вялікае выхаваўчае значэнне. Па-трэцяе, накіравала б сродкі на рамонт і аздабленне Дома культуры ў маіх родных Ашмянах, на ўмацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы цэнтральнай раённай бібліятэкі ў гэтым жа горадзе. Аднак для здзяйснення гэтых планаў патрэбны значна большыя выдаткі. Калі ж адштурхоўвацца ад прапанаванага мільярда рублёў, я рэалізавала б праект «Падарожжа ў Вялікі тэатр», закупіла б на яго квіткі ў Оперным тэатры на балет «Вітаўт» і падарыла б іх 4000 жыхароў сваёй Іўеўскай выбарчай акругі — дарослым і дзецям. Пасля «Вітаўта» кожны прысутны адчувае сябе сапраўдным патрыётам Беларусі.



**Павел САПОЦЬКА, старшыня Праўлення Мінскага абласнога аддзялення Беларускага фонду культуры:**

— Я выдаткаваў бы гэтыя сродкі на захаванне аб'ектаў гісторыка-культурнай спадчыны нашай краіны. Працуючы з арганізацыямі, якія садзейнічаюць аднаўленню такіх помнікаў, мне давялося ўбачыць, якая гэта важная і вельмі цяжкая справа. Палацы Адама Хмары ў Сёмкаве, Гутэн-Чапскіх у Прылуках, капліца Рэйтанаў каля Грушаўкі, шматлікія вадзяныя млыны... А калі б такіх мільярдаў у маім распараджэнні было некалькі, ці нават некалькі дзясяткаў, я ў першую чаргу накіраваў бы іх на рэалізацыю Дзяржаўнай праграмы «Замкі Беларусі» на 2012 — 2018 гады, на рэканструкцыю, рэстаўрацыю ці кансервацыю тых жа Крэўскага, Навагрудскага, Любчанскага, замка Сангушак у Смалянах і іншых. Я лічу, што захаваць гэтыя матэрыяльныя каштоўнасці — наш абавязак.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**

# НЕ ПРАВАЛІЦЬ МАДЭРНІЗАЦЫЮ ПРАЗ БЕЗГАСПАДАРЧАСЦЬ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Пры гэтым частка нараканняў была адрасавана кіраўніцтву Адміністрацыі Прэзідэнта за слабую падрыхтоўку самой рабочай паездкі. Агледзеўшы прадпрыемства, кіраўнік дзяржавы таксама выслухаў кароткія даклады іншых кіраўнікоў прадпрыемстваў канцэрна «Беллеспаперапрам», дзе рэалізуюцца інвестпраекты і па якіх таксама раней даваліся дакладныя даручэнні і вызначаліся тэрміны завяршэння работ. Пры гэтым Прэзідэнта цікавіла толькі адно пытанне — што не зроблена.

На заканчэнне Аляксандр Лукашэнка даручыў Камітэту дзяржаўнага кантролю дэталёва разабрацца са станам спраў у галіне і на канкрэтных прадпрыемствах. «Давайце дамовімся так: максімум 10 снежня збіраемся ў мяне па дрэваапрацоўцы», — сказаў беларускі лідар.

Старшыні КДК Аляксандру Якабсону Прэзідэнт даручыў стварыць камісію, аналагічную той, якая працавала па праблемных пытаннях у будаўнічай галіне. «Ствараеш камісію, глядзіш планы мадэрнізацыі і глядзіш глыбей, што там адбываецца, — сказаў ён. — Трэба прайсці кожнае прадпрыемства, усё, што ў дзяржаўнай праграме па мадэрнізацыі дрэваапрацоўчай прамысловасці. Плюс усе мае даручэнні асобна. Асаблівая ўвага Віцебску».

«Па Сямашку (першы віцэ-прэм'ер Уладзімір Сямашка. — **Заўвага БЕЛТА**) прымем рашэнне пасля таго, як правядзём гэту нараду», — дадаў Прэзідэнт Беларусі.

Сярод іншых кадравых рашэнняў кіраўніка дзяржавы — вызваленне Барыса Батуры ад пасады губернатара Мінскай вобласці, а Аляксандра Пераслаўцава — ад пасады старшыні канцэрна «Беллеспаперапрам». Сваёй пасады пазбавіўся таксама намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Андрэй Тур. Кіраўніку Адміністрацыі Прэзідэнта Андрэю Кабякову і Старшыні Камітэта дзяржкантролю Аляксандру Якабсону аб'яўлены строгія вымовы.

Аляксандр Лукашэнка таксама прыняў жорсткія рашэнні ў дачыненні гендырэктара будтрэста № 21 Мікалая Бусалава, які кіраваў будаўнічымі работамі на тэрыторыі прадпрыемства: «Падпіску пра нявыезд, вызваліць сёння ж ад займаемай пасады. Тузане за межы Барысава — пасадзіць. Завесці крымінальную справу па матэрыялах КДК і прыняць да расследавання». Аналагічна кіраўнік дзяржавы даручыў разабрацца і з вінаватымі ў парушэнні экалагічных нормаў — тэрыторыя прадпрыемства апынулася месцамі захламленай вытворчымі адходамі, а бераг размешчанага побач з заводам вадаёма стварае не менш гнятлівае ўражанне. «Разбярыцеся з санслужбай. Не — туды ж, у камеру яго за тое, што не сочыць за парадкам. Сваёй уладай разбярыцеся, не чакайце нікога», — сказаў Прэзідэнт, звяртаючыся да старшыні КДК Аляксандра Якабсона.

Нямала нараканняў было выказана і ў адрас праекціроўшчыкаў. Тут патрабаванне кіраўніка дзяржавы аналагічнае — разабрацца і пакараць вінаватых. «Па кіраўніку праектнай арганізацыі тое ж самае, што я сказаў па кіраўніку будаўнічай: падпіска аб нявыездзе, заводзьце крымінальную справу», — адзначыў беларускі лідар.

«Калі ў вас будуць хоць нейкія падазрэнні па старшыні канцэрна, па Батуры, па Сямашку — зараз жа ўключайце іх у крымінальную справу», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Міністру архітэктуры і будаўніцтва Анатолю Чорнаму Прэзідэнт таксама даў выразныя ўказанні па навядзенні парадку: «Пачынай працаваць. Гэта твой трэст. Цябе выратоўвае толькі тое, што ты працуеш (міністрам. — **Заўвага БЕЛТА.**) без году тыдзень. Наводзь жалезны парадак. Ты ведаеш, што тут рабіць».

**Паводле матэрыялаў БЕЛТА.**

# СУВЯЗІ, ЯКІЯ НАС ЗБЛІЖАЮЦЬ

**Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка накіраваў прывітанне ўдзельнікам Дзён духоўнай культуры Расіі ў Рэспубліцы Беларусь.**

«Правядзенне такой маштабнай акцыі — яскравае сведчанне таго, што шматвяковыя сувязі Беларусі і Расіі дзякуючы нашым сумесным намаганням набываюць новае дыханне, становяцца яшчэ больш актыўнымі і плённымі, — падкрэсліў Прэзідэнт Беларусі. — Мы фактычна жывём у адзінай духоўнай прасторы, дзе адбываецца пастаянны абмен думкамі, ідэямі і культурнымі багаццямі, якія створаны розумам і талентам двух народаў».

На думку Аляксандра Лукашэнкі, сімвалічна, што сёлетні творчы форум адкрывае канцэрт, прысвечаны Вялікай Перамозе: «Песні ваенных гадоў і сёння прымушаюць біцца сэрцы, нагадваючы аб тым, што толькі разам, у саюзе, мы магутныя і непераможныя».

«Няхай жа вечная, не падуладная часу музыка ў выкананні выдатных музыкантаў Расіі, якая гучыць на беларускай зямлі, яшчэ мацней зблізіць нас, а гэтае цудоўнае свята паслужыць далейшаму ўмацаванню дружбы і супрацоўніцтва брацкіх дзяржаў», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

■ Добрая навіна

# РАЗВІЦЦЁ РУХУ ЦЯГНІКОЎ ГАРАДСКІХ ЛІНІЙ ПАСПРЫЯЕ РАЗВІЦЦЮ ГАРАДОЎ-СПАДАРОЖНІКАЎ



Фота БЕЛТА.

**Прэм'ер-міністр Беларусі Міхаіл Мясніковіч адкрыў 7 лістапада абноўленую залу чакання вакзала станцыі Мінск-Пасажырскі, перадае карэспандэнт БЕЛТА. Асноўная задача пры рэканструкцыі гэтай залы заключалася ў тым, каб зрабіць яе максімальна зручнай для пасажыраў, укамплектаваўшы самым сучасным і пры гэтым даступным абсталяваннем.**

Цяпер тут пасажырам можна не толькі правесці час да адпраўлення цягніка ў камфортных умовах, але і атрымаць практычна ўсю неабходную ў паездцы інфармацыю, пачынаючы ад раскладу руху цягнікоў, аўтобусаў і самалётаў і заканчваючы паслугамі гасцініц і славутасцямі розных гарадоў Беларусі.

Акрамя таго, у зале чакання ўстаноўлены даведачныя тэрміналы і сем вадкакрысталічных інфармацыйных табло. Самае вялікае з іх — памерам 3х9. Такім чынам, створана комплексная сістэма інфармавання пасажыраў, якая забяспечвае даступнасць інфармацыі з любой кропкі залы чакання. Таксама ў ходзе рэканструкцыі залы выкананы работы па яе ўнутраным аздабленні, мадэрнізаваны інжынерныя камунікацыі. Падняцца з платформаў у залу чакання можна па травалатарах (дарожках, якія рухаюцца).

Таксама Міхаіл Мясніковіч прыняў удзел у цырымоніі адкрыцця рэгулярнага руху цягнікоў гарадскіх ліній на ўчастку Мінск — Рудзенск.

Кіраўнік урада падкрэсліў сацыяльную значнасць гэтага аб'екта, адзначыўшы, што яго адкрыццё дазваляе вырашыць пытанні камфорту не толькі мінчан, але і жыхароў усёй Мінскай вобласці. «Ствараюцца камфортныя ўмовы для іх паездак на працу, а таксама для таго, каб яны маглі дакрануцца да тых культурных каштоўнасцяў, якія створаны ў Мінску», — адзначыў прэм'ер. «Гэта таксама і рашэнне пытанняў развіцця гарадоў-спадарожнікаў», — дадаў ён. Спрыяць гэтаму будзе паляпшэнне транспартных сувязяў, павышэнне зручнасці перавозак пасажыраў, удасканаленне маршрутнай сеткі гарадскога грамадскага транспарту, а таксама зніжэнне нагрузкі на вулічную дарожную сетку сталіцы.

Як паведамілі ў Беларускай чыгунцы, адкрыццё рэгулярнага руху цягнікоў гарадскіх ліній на ўчастку Мінск — Рудзенск з'яўляецца чарговым крокам БЧ па развіцці пасажырскіх перавозак, павышэнні якасці аказваемых паслуг. З 7 лістапада па гэтым маршруце ў рэгулярныя зносіны ўводзяцца дзевяць пар цягнікоў гарадскіх ліній. Сучасныя саставы будуць пераадольваць адлегласць ад сталіцы да Рудзенска за 48-50 хвілін. Акрамя таго, на ўчастку Мінск — Рудзенск будзе курсіраваць 25 пар цягнікоў рэгіянальных ліній эканом-класа.

Адкрыццю рэгулярнага руху цягнікоў гарадскіх ліній папярэднічала маштабная мадэрнізацыя інфраструктуры ўчастка Мінск — Рудзенск, якая закранула ўсе станцыі і прыпыначныя пункты, размешчаныя на маршруце. У тым ліку праведзена рэканструкцыя станцый Мінск-Паўднёвы, Калядзічы, Міханавічы, Рудзенск, прыпыначнага пункта Лошыца.

Адным з найважнейшых на маршруце з'яўляецца прыпыначны пункт Лошыца, які не толькі злучае два мікрараёны — Курасоўшчыну і Лошыцу — але і найбольш інтэграваны ў гарадскую транспартную інфраструктуру. У ходзе рэканструкцыі тут быў пабудаваны пешаходны тунэль, з абодвух бакоў якога ўзведзены касавыя павільёны, пабудаваны дзве пасажырскія платформы з навесамі, выкананы работы па пуцявым пераўладкаванні, рэканструкцыі кантактнай сеткі.

Гаворачы пра перспектывы развіцця гарадскіх ліній, у Беларускай чыгунцы адзначылі, што ў 2015 годзе плануецца арганізаваць рух цягнікоў гарадскіх ліній па маршруце Мінск — Смалявічы, а да 2020 года — па маршруце Мінск — Дзяржынск. Таксама будзе працягнута ўдасканаленне сістэмы аплаты праезду. У 2014 годзе ў цягніках гарадскіх ліній плануецца ўкараніць сістэму аплаты і кантролю праезду з прымяненнем смарт-картак, што дазволіць пасажырам афармляць яго непасрэдна ў цягніках шляхам актывацыі смарт-картак на спецыяльных счытвальных прыстасаваннях.

# КРЫМІНАЛЬНЫ КОДЭКС ЧАКАЮЦЬ ПЕРАМЕНЫ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Выкананне дасудовага дагавора будзе правярацца пракуратурай і судовымі органамі. Законапраект прапануе на папярэднім судовым пасяджэнні вырашаць пытанне аб прызначэнні судовага разгляду па крымінальнай справе ў дачыненні да абвінавачанага, які заключыў дасудовы дагавор. На папярэднім пасяджэнні можа быць вырашана і пытанне пра вяртанне справы пракурору і спыненне вытворчасці па справе. Дасудовы дагавор неабходна будзе складаць пры ўдзеле адваката. Могуць ужывацца і розныя меры па абароне абвінавачанага, які заключыў такі дагавор.

## Не крымінал

Законапраект прадугледжвае дэкрыміналізацыю некаторых артыкулаў Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь. «Гаворка ідзе пра пэўныя злачынствы супраць уласнасці, парадку ажыццяўлення эканамічнай дзейнасці, парадку кіравання, інтарэсаў службы. Напрыклад, гэта артыкул 220 (нядобрасумленная ахова маёмасці), артыкул 259 (фальсіфікацыя сродкаў вымярэння), артыкул 261 (незаконныя дзеянні ў дачыненні да паштовых марак, іншых знакаў паштовай аплаты, міжнародных зваротных купонаў, імянных рэчаў), артыкул 262 (падробка прыязных дакументаў), артыкул 383 (самаўпраўнасць) Крымінальнага кодэкса. Такія злачынствы не ўяўляюць вялікай грамадскай небяспекі», — паведаміла Людміла Міхалькова.

З 2002 па 2011 год па артыкуле 220 Крымінальнага кодэкса, напрыклад, было асуджана толькі 6 чалавек. Гэтыя навелы прапанаваны з улікам вывучэння досведу Расіі, Літвы, Казахстана і іншых дзяржаў.

Акрамя таго, прапануецца знізіць ніжнія межы тэрмінаў пакаранняў за некаторыя злачынствы супраць уласнасці і ўвесці ў санкцыі некаторых артыкулаў асноўнае ці дадатковае пакаранне ў выглядзе штрафу. Дарэчы, за эканамічныя злачынствы памеры штрафу прапануецца павялічыць да 6 тыс. базавых велічынь.

## Рэцыдывісты — асобна

З мэтай падзяліць асуджаных на тых, хто можа выправіцца, і на тых, хто ўжо наўрад ці зменіцца, уводзіцца змена ў артыкул 43 Крымінальнага кодэкса. Гаворка ідзе пра прызнанне злачынца асабліва небяспечным рэцыдывістам.

Старшыня парламенцкай камісіі па заканадаўстве растлумачыла, што, згодна з дзейсным Кодэксам, асабліва небяспечным рэцыдывістам прызнаецца чалавек, які здзейсніў цяжкае ці асабліва цяжкае злачынства і раней не менш за два разы быў асуджаны і адбываў пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі за асабліва цяжкія злачынствы. Гэта значыць, не заўсёды чалавек, які мае па 5 — 6 судзімасцяў, можа патрапіць у гэтую катэгорыю. Атрымліваецца, што апошнія адбываюць пакаранне разам з тымі, хто здзейсніў, напрыклад, толькі другое злачынства, прычым не цяжкае. Пры гэтым тыя, хто мае па 5—6 «адсідак», адмоўна ўплываюць на астатніх.

Законапраект прапануе прызнаваць асабліва небяспечным рэцыдывістам чалавека, які здзейсніў асабліва цяжкае злачынства пасля таго, як ён адбыў пакаранне за цяжкае злачынства.

## Кампенсацыя замест тэрміну

Аб гуманізацыі заканадаўства сведчыць, па меркаванні парламентарыя, прапанаваная ў праекце магчымасць крымінальна-прававо́й кампенсацыі, якая стане ўмовай вызвалення ад крымінальнай адказнасці, асуджэння з умоўным пакараннем, ужываннем пакаранняў, якія не звязаны з пазбаўленнем волі.

Памер крымінальна-прававо́й кампенсацыі будзе складаць ад 30 да 100 базавых велічынь. Пры гэтым яна павінна скласці не менш за 50 працэнтаў ад прычыненай шкоды. «Занясенне гэтай сумы на дэпазітны рахунак органа праследавання ці суда не будзе вызваляць асобу ад пакрыцця іншых выдаткаў, якія звязаны са злачынствам», — падкрэсліла Людміла Міхалькова. Гэта значыць, да прыкладу, пасля выплаты такой кампенсацыі ўсё адно трэба будзе пакрываць у поўным памеры шкоду, якая прычынена пацярпеламу боку.

Крымінальна-прававая кампенсацыя будзе ўжывацца толькі ў дачыненні да злачынстваў, якія лічацца менш цяжкімі або не ўяўляюць вялікай грамадскай небяспекі. Дэпутат падкрэсліла: «Гэта вельмі гуманная мера для тых, хто спатыкнуўся, але не збіраецца ў далейшым весці злачынны лад жыцця».

## За пагрозу забойствам — 2 гады

Змяняюцца і падыходы да пакарання за вываз людзей за мяжу ў мэтах сексуальнай эксплуатацыі. Прапануецца дакладна размежаваць гэта з такім злачынствам, як выкарыстанне занятку прастытуцыяй. У гэтых мэтах будуць унесены змены ў дадатак да артыкула 181 Крымінальнага кодэкса (гандаль людзьмі).

Прапануецца ўзмацніць адказнасць па артыкуле 186 Крымінальнага кодэкса (пагроза забойствам, прычыненнем цяжкіх цялесных пашкоджанняў ці знішчэннем маёмасці). З'явіцца новая санкцыя — да двух гадоў пазбаўлення волі. Разам з тым, застануцца і альтэрнатыўныя санкцыі — напрыклад, штрафы.

Узмацняецца адказнасць за лжывы данос і лжывыя паказанні. Тут таксама ўводзіцца санкцыя — пазбаўленне волі.

Чакаюцца і змены парадку ўмоўна-датэрміновага вызвалення, а таксама вызвалення пад заклад. Акрамя таго, папраўкамі плануецца абмежаваць максімальныя тэрміны арышту — не больш за тры месяцы для дарослых і двух месяцаў для непаўналетніх. Пры гэтым выключаецца магчымасць умоўна-датэрміновага вызвалення.

— Прапануемыя змены накіраваны ў першую чаргу на гуманізацыю і аптымізацыю пакаранняў, растлумачэнне складаных нюансаў праваўжывальнай практыкі — у прыватнасці, па справах пра лжэпрадпрымальніцтва, незаконную прадпрымальніцкую дзейнасць, рабагандаль, утрыманне прытонаў, распаўсюджванне парнаграфіі. Акрамя таго, папраўкі маюць на ўвазе ўзмацненне адказнасці для педафілаў, а таксама для арганізатараў фінансавых пірамід, — падкрэсліла Людміла Міхалькова.

Заканадаўцы маюць намер падрыхтаваць дакумент да разгляду ў першым чытанні на восеньскай сесіі Палаты прадстаўнікоў.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

■ Нерухомасць

# У сталіцы распрацоўваецца стратэгія будаўніцтва арэнднага жылля

**Гэта неабходна зрабіць у бліжэйшыя два тыдні, заявіў днямі старшыня Мінскага гарвыканкама Мікалай Ладуцька на аператыўнай нарадзе ў мэрыі.**

Сталічны кіраўнік падкрэсліў, што адміністрацыям раёнаў, камітэтам і ўпраўленням гарвыканкама неабходна правесці адпаведныя нарады і на працягу двух тыдняў выпрацаваць дакладныя падыходы па аб'ёмах будаўніцтва арэнднага жылля і інтэрнатаў у Мінску.

Генеральны дырэктар дзяржаўнага аб'яднання «Мінская гарадская жыллёвая гаспадарка» Уладзімір Хадарцэвіч паведаміў, што цяпер падрыхтаваны праект рашэння Мінгарвыканкама па арэндным жыллі, у адпаведнасці з якім плануецца, што Мінская гарадская жыллёвая гаспадарка будзе акумуляваць грашовыя сродкі для арэнднага жылля. Сёння гэтыя сродкі складаюць 1,9 млрд рублёў. Акумуляваныя сродкі будуць накіроўвацца на рамонт памяшканняў арэнднага жылля, выраб праектна-каштарыснай дакументацыі або на будаўніцтва. Мікалай Ладуцька падкрэсліў, што задача не толькі ў тым, каб размяркоўваць сродкі. На яго думку, неабходна сфарміраваць перспектывы развіцця арэнднага жылля ў сталіцы такім чынам, каб распрацаваная стратэгія была выразнай, зразумелай і сапраўды маштабнай.

**Сяргей КУРКАЧ**

ПРОДАЕТСЯ
бизнес-центр Кристалл, 9 030 м²
УНП 100080849
Офисные, торговые, производственные, складские помещения.
Удобное расположение
г. Гомель, ул. Ильича, 331-2
Рассрочка. Тел. (029) 195-56-81.

■ Факт

## «КВЕТКАВАЯ ЛІХАМАНКА»

**На мытным пасту «Каменны Лог» ашмянскія мытнікі за суткі затрымалі тры грузавыя аўтамабілі, якія перавозілі свежазрэзаныя кветкі. Колькасць «тавару для дам» істотна перавышала заяўленую ў камерцыйных дакументах.**

«Усе аўтамабілі накіроўваліся ў Расію з краін Еўрасаюза, — удакладнілі ў прэс-службе Ашмянскай мытні. — А колькасць «лішніх» кветак здзівіла нават вопытных супрацоўнікаў: 36 тысяч хрызантэм, гербер і гіпсафіл у асартыменце, 40 тысяч гваздзікоў і 150 тысяч руж». Агульная колькасць затрыманых кветак склала каля 226 тысяч штук на рэкордную суму больш як 3,5 млрд рублёў. Па гэтым факце распачаты адміністрацыйны працэс.

**Надзея ПАЎЛАВА.**

## ЗАТРЫМАЛІ БОЛЬШ ЗА 21 ТОНУ ВІНАГРАДУ

**Супрацоўнікі Віцебскай мытні на аўтадарозе Брэст — Масква затрымалі грузавік, на якім везлі 21,1 тоны свежага вінаграду.**

— Кіраваў «Вольвай» з паўпрычэпам — грамадзянін Літвы. Паколькі адпаведных суправаджальных дакументаў на груз не было, тавар і транспартныя сродкі агульным коштам больш як 1,2 мільярда рублёў затрыманы, — паведамілі ў аддзеле ідэалагічнай працы Віцебскай мытні.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## ПРАД'ЯЎЛЕНА КАНЧАТКОВАЕ АБВІНАВАЧВАННЕ

**Завершана папярэдняе следства па крымінальнай справе ў дачыненні да былога намесніка старшыні Барысаўскага раённага выканаўчага камітэта.**

Нагадаем, чыноўніка затрымалі ў красавіку гэтага года ў службовым кабінеце па падазрэнні ў атрыманні хабару ў памеры 13 тысяч долараў за спрыяльнае вырашэнне пытання, якое ўваходзіць у яго кампетэнцыю. Пасля гэтага ў дачыненні да падазронага была распачата справа па ч. 3 арт. 430 Крымінальнага кодэкса (атрыманне хабару службовай асобай, якая займае адказнае становішча, у асабліва буйным памеры).

Агульная сума незаконна атрыманых службовай асобай грашовых сродкаў — больш за 35 000 долараў.

На маёмасць і грашовыя сродкі абвінавачанага (на суму звыш 315 мільёнаў рублёў) накладзены арышт.

**Надзея ДРЫЛА.**

## ПА ЧЫГУНЦЫ — ПА НОВЫХ ТАРЫФАХ

**З 10 лістапада ўстанаўліваецца новы тарыф на перавозкі пасажыраў паяздамі рэгіянальных ліній эканом-класа.**

У адпаведнасці з пастановай Міністэрства эканомікі ад 8.10.2013 №74, з названай даты зонны тарыф складзе 900 рублёў, тарыф за адзін кіламетр — 90 рублёў.

Парадак разліку кошту праезду наступны: зонны тарыф 900 рублёў выкарыстоўваецца пры разліку кошту праезду ад станцыі ці прыпыначнага пункта адпраўлення пасажыра на адлегласць не больш за 5 кіламетраў; пры разліку кошту праезду на адлегласць больш за 5 кіламетраў бярэцца зонны тарыф 900 рублёў і дадаткова за кожны кіламетр — 90 рублёў.

Такім чынам, тарыф на перавозкі пасажыраў паяздамі гарадскіх ліній складзе: на маршрутах ці ўчастках маршрутаў Мінск-Пасажырскі — Ждановічы, Мінск-Пасажырскі — Беларусь, Мінск-Пасажырскі — Міханавічы, Міханавічы — Рудзенск — 5 тысяч рублёў за адну паездку, Мінск-Пасажырскі — Рудзенск — 6 тысяч рублёў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# КАСТРЫЧНІЦКІЯ ПАДАРУНКІ

**«Чырвоны дзень календара» стаў нагодай для адкрыцця каля 10 розных сацыяльных, вытворчых, жылых аб'ектаў на тэрыторыі Магілёўскай вобласці. Пра гэта паведаміў падчас адкрыцця аднаго з іх — радзільнага аддзялення Бялыніцкай райбальніцы — губернатар вобласці Пётр Руднік.**

У Горках пасля капрамонту адчыніла дзверы дзіцячая школа мастацтваў і мастацкіх рамёстваў, дзе, па інфармацыі намесніка начальніка аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі райвыканкама Марыі Студневай, займаецца больш за 200 юных талентаў.

У Бабруйску адсвяткавалі наваселле выхаванцы Цэнтра творчасці дзяцей і моладзі, дзе для іх запрацавала адрамантаваная спартзала.

У Крычаўскім раёне новы добраўпарадкаваны дом атрымалі пацыенты бальніцы сястрынскага догляду. Дагэтуль ім прыходзілася туліцца ў старым (1936 года) будынку.

— Зараз бальніца пераехала ў адрамантаваны корпус былой чыгуначнай палiклінікі, дзе нашмат камфортней, — адзначыў галоўны ўрач раённай бальніцы Аляксандр Плятнёў. — Яна разлічана на 35 месцаў. Усе пацыенты — адзінокія і адзінока пражываючыя пенсіянеры.

Для пажылых грамадзян улады Крычава падрыхтавалі яшчэ адзін падарунак: пры раённым цэнтры сацыяльнага абслугоўвання з'явілася аддзяленне дзённага знаходжання. Людзі ва ўзросце змогуць з карысцю правесці тут свой вольны час: асвоіць новае рамяство, пагуляць у шашкі, пазаймацца на трэнажорах. Памяшканне, дзе размясціўся цэнтр, абсталявана ўсім неабходным, у тым ліку і ўласнай кухняй.

А для пацыентаў Крычаўскага псіханеўралагічнага дома-інтэрната ў вёсцы Свадкавічы запрацаваў новы лазнева-пральны камбінат, абсталяваны сучаснай тэхнікай.

Прыўзняты настрой быў і ў жыхароў Кіраўскага раёна, якім у гэтыя дні ўручылі ключы ад новых кватэр у нядаўна здадзеным шматпавярховіку. Сярод 50 шчаслівых сем'яў-навасёлаў — 18 шматдзетных.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

# УЖО НЕ АДЗІНОКІЯ

**Пустуючы будынак у вёсцы Крывічы Іўеўскага раёна задзейнічаны для дома сумеснага самастойнага пражывання адзінокіх пажылых людзей.**

Першымі навасельцамі сталі 5 чалавек з розных вёсак раёна. А ўвогуле дом разлічаны на 10 чалавек, для якіх створаны дастойныя ўмовы пражывання. Ёсць 5 утульных двухмесных пакояў, агульны пакой адпачынку, кухня, санвузел, душавая. Адзін з пакояў — «крызісны», прызначаны для людзей, якія трапілі ў цяжкую жыццёвую сітуацыю і аказаліся без жылля. Каля дома будуць агарод і гаспадарчая пабудова для ўтрымання, напрыклад, курэй. Неабходную дапамогу людзям акажа сацыяльны работнік. У абсталяванні дома (будзе нават беспраўдны інтэрнэт) спонсарскую дапамогу аказваюць прадпрыемствы і арганізацыі. А на будаўнічых работах выкарыстана каля 470 мільёнаў рублёў з раённага бюджэту. Затраты маглі быць і значна большымі, аднак практычна ўсё выканалі гаспадарчым спосабам, паведаміў намеснік старшыні Іўеўскага райвыканкама Аляксандр Раманюк.



Фота БЕЛТА.

Дом сумеснага самастойнага пражывання пажылых грамадзян адкрыўся таксама ў вёсцы Далёкія Лідскага раёна дзякуючы рэканструкцыі часткі будынка былой школы за сродкі раённага бюджэту і тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання. Належным чынам абсталяваны чатыры жылыя пакоі, кухня, пакой адпачынку і іншыя памяшканні. Да канца сёлетняга года такія дамы прымуць навасельцаў у Слонімскім і Дзятлаўскім раёнах. А першы дом сумеснага самастойнага пражывання пажылых людзей на Гродзеншчыне адкрыўся пазалетась у аграгарадку Бялкоўшчына Смаргонскага раёна.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

В **суд Полоцкого района г. Полоцка Витебской области** поступило заявление о признании безвестно отсутствующим ШЕМЁНКА Евгения Сергеевича, 31.07.1985 года рождения, место рождения — г. Полоцк, Витебская обл., последнее известное место жительства — г. Полоцк, переулок Лесной, дом № 1 Витебской области, с просьбой ко всем гражданам и юридическим лицам сообщить имеющиеся сведения о Шемёнке Евгении Сергеевиче в течение 2-х месяцев с момента публикации.

**К сведению акционеров ОАО «Современные розничные технологии»**

**22 ноября 2013 года в 9 часов 00 минут по адресу: г. Минск, ул. Мирошниченко, 3 СОСТОИТСЯ ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ ОАО «Современные розничные технологии»**

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**
1. Об аннулировании акций, выкупленных по требованию акционеров.
2. Об уменьшении размера уставного фонда.
3. Об изменении наименования организации.
4. О создании филиалов
5. О внесение изменений в устав.

Регистрация лиц, имеющих право на участие в общем собрании акционеров, будет проводиться по месту проведения собрания с 08 часов 00 минут до 08 часов 45 минут.

Акционер Общества принимает участие в работе собрания лично или через своего представителя, действующего на основании доверенности. Для регистрации на собрании необходимо при себе иметь паспорт, доверенность.

Дата формирования реестра владельцев ценных бумаг, на основании которого составляется список лиц, имеющих право на участие в общем собрании акционеров общества, – 18 ноября 2013 года.

С материалами, подготовленными к собранию, акционеры могут ознакомиться в рабочие дни с 09 часов 00 минут до 17 часов 00 минут с 14 по 21 ноября 2013 года по адресу: г. Минск, ул. Мирошниченко, 3 (приемная) в день проведения собрания – по месту его проведения.

Орган, созывающий общее собрание акционеров ОАО «Современные розничные технологии», – наблюдательный совет.

*Наблюдательный совет, тел. 017 261 00 89.*

УНП 690019195

Утерянный оригинал свидетельства о государственной регистрации коммерческой организации ОДО «Фуртим» (УНП 190726602) **считать недействительным.**

УНП 490317354

**ИЗВЕЩЕНИЕ**
**о проведении 11 декабря 2013 года открытого аукциона по продаже объекта недвижимости**
**Продавец, юридический адрес:**
**Открытое акционерное общество «Жлобинская швейная фабрика»,**
247210, Гомельская область, г. Жлобин, ул. Петровского, 17, тел. (02334) 2 26 90

| № лота | Наименование объекта (лота) | Краткая характеристика и адрес объектов (лота) |
|---|---|---|
| 1 | **Нежилое изолированное помещение, инв. № 320/D-28658** | Назначение: помещение неустановленного назначения Особые отметки: в состав изолированного помещения входит смотровая яма Общая площадь: 66,2 кв.м |
| | Адрес объекта | г. Жлобин, ул. Петровского, 17-3б |
| | Начальная цена продажи объекта (лота) с НДС | **96 000 000** белорусских рублей |
| | Задаток | **500 000** белорусских рублей |

Аукцион состоится **11 декабря 2013 г. в 11.00** по адресу: г. Жлобин, Петровского, 45, 2-й подъезд.

Организатор торгов – Коммунальное унитарное предприятие по операциям с недвижимым имуществом «Жлобинский центр управления районной коммунальной собственностью», 247210, Гомельская область, г. Жлобин, Петровского, 45, 2-й подъезд.

Возможность ознакомиться с объектом предоставляется продавцом в срок по **5 декабря 2013 г.** включительно.

Желающим участвовать в аукционе необходимо в срок **по 5 декабря 2013 года 9.00 до 17.00 по рабочим дням** представить в адрес организатора аукциона необходимый пакет документов.

Телефоны организатора аукциона для справок: (02334) 2 18 18, 3 14 08.

*Полный текст извещения опубликован в газете «Новы дзень» № 86 от 05.11.2013 года,* а также в Интернете на сайте Жлобинского райисполкома **gisp.by**

# ПАЙШОЎ З ЖЫЦЦЯ НАШ КАЛЕГА — ЖУРНАЛІСТ ГЕНАДЗЬ ХУДЗІНСКІ

**Ён, ураджэнец Івацэвіцкага краю, з дзяцінства марыў аб прафесіі вайскоўца. Скончыўшы Мінскае суво́раўскае і Львоўскае ваенна-палітычнае вучылішчы, служыў карэспандэнтам у чыгуначных войсках на Далёкім Усходзе і на Урале. Амаль дзесяць гадоў правёў на будаўніцтве Байкала-Амурскай магістралі — на адным з самых цяжкадаступных яе ўчасткаў.**

Калі Беларусь стала самастойнай дзяржавай, вярнуўся з сям'ёй на Радзіму. Газета «Во славу Родины», прэс-службы Міністэрства абароны і Дзяржасакратарыята Савета Бяспекі — гэта ўжо вехі беларускай вайсковай службы палкоўніка Генадзя Худзінскага.

У жыцці гэта быў надзвычай сціплы і сумленны чалавек. Ён меў рэпутацыю добрасумленнага афіцэра і надзейнага таварыша. Яму ў жыцці хапала цяжкасцяў. Але Генадзь Міхайлавіч заўсёды працаваў, не скардзячыся на абставіны. Ніколі не падводзіў і трымаў слова. Так было заведзена ў таежным далёкаўсходнім пасёлку Бярозавым, дзе маладым лейтэнантам пачынаў сваю «бамаўскую» службу. І працягвалася, калі служыў у Беларусі.

Выйшла так, што ў запас яму давялося звальняцца заўчасна: пачалося рэфармаванне арміі. Але і пасля звальнення Генадзь Міхайлавіч не апусціў рук і не здрадзіў мары — працягваў працаваць — журналістам у розных цэнтральных рэспубліканскіх выданнях.

5 лістапада радкі яго чарговых матэрыялаў для газеты засталіся недапісанымі. На пядзьдзясят пятым годзе жыцця...

Бланк страхового полиса ББ№ 0234181, принадлежащий ОАСО «Би энд Би иншуренс Ко», **считать утерянным.**

Ірына КЛЁНАВА:

■ Медыяперсона

# «У ЭФІРЫ Я ІМКНУСЯ БЫЦЬ МУЗЫКАЙ»



**Яна супраць рамак і стэрэатыпаў. Не перастае здзіўляцца прыгажосці прыроды, дзіцячай непасрэднасці, паводзінам свайго сабакі і геніяльнасці твораў мастацтва. Любіць хуткасць, але заўсёды стараецца змякчаць «лабавыя сутыкненні» ў жыцці. Папулярнасць лічыць вынікам паспяховай кар'еры, адлюстраваннем якасці зробленай працы. Усё яшчэ адчувае няёмкасць, калі яе пазнаюць, але не можа не расчуліцца, калі чуе, напрыклад, ад даішнікаў «чаму вы не беражаце сябе, вы нам патрэбны». Думаецца, што падтрымаюць такую думку і слухачы радыё «Мір», якія кожны будны дзень настройваюцца з Ірынай Клёнавай на агульную хвалю вячэрняга эфіру. Пра ўзаемаадносіны з аўдыторыяй, перспектывы ў творчасці і адстойванне ўласнай пазіцыі мы разважаем разам з вядомай тэлерадыёвядучай.**

***— Пра якую прафесію вы марылі ў дзяцінстве?***

— Я хацела стаць артысткай. З дзяцінства выступала «на табурэтачцы» для гасцей — чытала вершы. Перад люстэркам, загарнуўшыся ў стракатую гардзіну, прымярала вобраз Мірэй Мацье: у маміным парыку млява мурлыкала «чао, бамбіна, соры». І гэта ў шасцігадовым узросце! Потым была музычная школа па класе фартэпіяна, выступленні з канцэртамі, аматарскі тэатр. Пасля заканчэння курсаў англійскай мовы ў Доме афіцэраў мне дасталася галоўная і вельмі «гаваркая» роля: ва ўрыўку з камедыі Оскара Уальда «Як важна быць сур'ёзным» я іграла Сесілі. На той момант і жаданне быць актрысай ужо, здавалася, знікла, і завучванне такой колькасці тэксту не натхняла, але мой педагог праявіла настойлівасць. Давялося памучыць тэлевізійных касцюмераў (я тады працавала на тэлебачанні), каб знайсці сукенку а-ля «XIX стагоддзе, брытанскія жарсці», і выходзіць на сцэну. Памятаю, пасля спектакля мне падаравалі шмат кветак і доўга крычалі «брава» — тады я адчула сябе сапраўднай тэатральнай прымай (*усміхаецца*).

**У наш перагружаны інфармацыяй век чалавеку патрэбна добрая энергетыка, далікатнасць і тонкі саўдзел.**

***— Чым вас зацікавіла журналістыка?***

— Перш за ўсё тым, што можна назіраць за падзеямі і выказваць свае думкі. А яшчэ магчымасцю разглядваць (вывучаць) людзей. З узростам зразумела, што такое становішча больш цікавае, чым тое, калі вывучаюць цябе (а так і адбылося б, калі б я стала актрысай).

***— Хто паўплываў на ваша станаўленне ў прафесіі?***

— На жаль (ці, можа, на шчасце?) на розных працоўных месцах маё начальства, калі адпраўляла калег на стажыроўкі ў іншыя гарады і краіны, мне казала: «Іра, навошта табе ехаць? Ты ж і так ўсё ведаеш». Я так ні разу не пабывала ні ў адной, ні разу! А вельмі хацелася, бо падазраю, што я не ўсё ведаю, і, думаю, усё ж магла б нечаму павучыцца (*усміхаецца*). Таму адкажу так: мой настаўнік у прафесіі — жыццё, мае асабістыя назіранні і адчуванні.

***— Чаго патрабуе праца ў вячэрнім эфіры?***

— Настрою ў першую чаргу. Добразычлівасці, мяккага гумару. У наш перагружаны інфармацыяй век чалавеку патрэбна добрая энергетыка, далікатнасць і тонкі саўдзел. Мне здаецца, што сёння слухач імкнецца не туды, дзе яго клічуць у «кола» пасяваць, патанцаваць і пагуляць. Гіперактыўнасць стамляе, і аўдыторыя пераключаецца туды, дзе музыка. Зноў жа я кажу пра самадастатковых людзей, якія, калі і трымаюць радыё ў полі сваіх інтарэсаў, то толькі фонам. Таму, арыентуючыся на такую аўдыторыю, увечары я сама імкнуся «быць музыкай» і не перагружаць слухача тэкстамі. Праўда, атрымліваецца гэта не заўсёды, бо часам «заносіць» (*усміхаецца*).

***— Самі слухаеце радыё?***

— Толькі за рулём аўтамабіля. І то вельмі хутка пераходжу на што-небудзь любімае, запісанае на кампакт-дыску ці ў фармаце mp3.

***— Кажуць, у спрэчцы нараджаецца ісціна, а як вы любіце даказваць сваю пазіцыю?***

**13.40** «Запаведнай сцежкай». Заказнік «Карачэўскі мох».
**14.10** «Загадкі дзеда Кандрата». Дак. фільм.
**14.40** «Таямніцы біяграфіі». Народны мастак СССР і Беларусі Міхаіл Савіцкі.
**15.15, 20.45 «Атланты і карыятыды». Маст. фільм.**
**16.50** «Скарбніца Гарадзеншчыны». Стары замак у Гродне.
**17.20** «Маем рэчы». Хлеб.
**17.35** «Настальжы». Заслужаная артыстка Рэспублікі Беларусь Таццяна Мархель.
**18.00** «Лабірынты». Архітэктар Лявон Вітан-Дубейкаўскі.
**18.35** «Воплеск адной далоні».
**19.10 «Музычная гісторыя». Маст. фільм.**
**20.30** Калыханка.

### БЕЛАРУСЬ 5

**8.05** Дак. фільм «Кропка адліку. У Германію па вопыт».
**8.35** Хакей. Чэмпіянат Беларусі. «Металург» (Жлобін) — «Хімік-СКА».
**10.25** Фактар сілы.
**10.50** Хакей. КХЛ. «Металург» (Магнітагорск) — «Дынама» (Мінск).
**12.55** Валейбол. Чэмпіянат Еўропы. Жанчыны. Паўфінал.
**14.55** Футбол. ЧМ-2014. Адборачны матч. Беларусь — Францыя.
**16.40** Футбол. Чэмпіянат свету-2014. Відэачасопіс.
**17.10** Гандбол. Ліга чэмпіёнаў. «Металург» (Македонія) — «Дынама-Мінск».
**18.45** Футбол. Беларусбанк — Чэмпіянат Рэспублікі Беларусь. «Шахцёр» — «Дынама» (Мінск).
**20.30** Час футбола.
**21.20** Гандбол. Ліга чэмпіёнаў. «Дынама-Мінск» — «Барселона».
**22.55** Дак. фільм «Кропка адліку. Погляд з-за куліс».

### АНТ

**6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здорава!».
**10.25** «Кантрольная закупка».
**11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00** Навіны спорту.
**11.10 Серыял «Закрытая школа».**
**12.10** «Самы лепшы муж».
**13.10** «Добрага здароўейка!».
**13.55** «Модны прыгавор».
**15.00** «Сам-насам з усімі».
**16.15 Серыял «Хатняя работніца».**
**16.55** «Давай пажэнімся!».
**18.20** «Наша Белараша».
**18.55** «Няхай гавораць».
**20.00** Час.
**21.05 Маст. фільм «Каралева».**
**23.00** «Вячэрні Ургант».
**23.35 Камедыя «Аб'ект майго захаплення».**
**1.35** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.20** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10** «СТБ-спорт».
**9.00, 13.50, 20.15** «Гарады, якія спяваюць». Дзённік.
**9.10, 18.30** «Нам і не снілася»: «Каварства лёсу».
**10.05** «Скардзіцца дазволена».
**10.40, 17.30** «Званая вячэра».
**11.35 «Слова жанчыне». Серыял.**
**12.30** «Джэймі: у пошуках смаку».
**13.00** «Прыгоды дылетанта».
**14.00 Маст. фільм «Прыватнае жыццё Піпы Лі».**
**15.50** «Уявіце сабе».
**16.50** «Па законе».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.30 Маст. фільм «З пекла ў пекла».**
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Тайны свету».
**0.00** «Аўтапанарама».
**0.25 «Дэсантура. Ніхто, акрамя нас». Серыял. Заключныя серыі.**

### МІР

**5.00 Серыял «Пяць хвілін да метро».**
**6.35** М/ф.
**7.05** «Цік-так».
**7.20 Серыял «Заручальны пярсцёнак».**
**9.00, 12.00, 15.00, 18.00, 21.00** Навіны Садружнасці (бягучы радок).
**9.10 Маст. фільм «Разлука».**
**10.50, 0.40** «Свае людзі».
**11.15** «Дыяспары».
**11.45** «Кыргызстан у асобах».
**12.20, 2.25 Серыял «Клон».**
**14.10** Дак. фільм «У свеце цудаў».
**15.20, 22.05** Ток-шоу «Слова за слова».
**16.20 Серыял «Бумеранг з мінулага».**
**18.25** «Злачынства і пакаранне».
**19.00 Серыял «Дом на набярэжнай».**
**21.25** «Акцэнты».
**21.40** «Наша марка».
**23.00 Серыял «Тайная варта».**
**1.05 Маст. фільм «Алмазы для Марыі».**
**4.05** Дак. фільм «У свеце мінулага».

### РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00** «Раніца Расіі».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Прамы эфір».
**12.40 Серыял «Справа следчага Нікіціна».**
**13.50, 16.50, 19.50, 22.35** Навіны — Беларусь.
**14.30** «1000 дробязяў». Ток-шоу.
**15.10** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
**15.55** «Асаблівы выпадак».
**17.10 Серыял «Права на праўду».**
**18.05 Серыял «Ефрасіння. Таежнае каханне».**
**18.55 Серыял «Тайны інстытута высакародных дзяўчат».**
**20.40 Серыял «Абаронца».**
**22.30** Навіны — Беларусь.
**22.40 Серыял «Земскі доктар. Вяртанне».**
**0.25** «Паядынак».

### НТБ—БЕЛАРУСЬ

**6.00** «НТБ раніцай».
**8.35** «Выратавальнікі».
**9.05** «Медыцынскія тайны».
**9.35, 10.20 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**10.55** «Да суда».
**11.55** «Суд прысяжных».
**13.25** «Суд прысяжных. Канчатковы вердыкт».
**14.25** «Справа ўрачоў».
**15.15** «Справа густу».
**15.40, 18.35** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**16.25** «Пракурорская праверка».
**17.35** «Гаворым і паказваем». Ток-шоу.
**19.35 Серыял «Шэф-2».**
**21.20 Серыял «Пятніцкі. Глава трэцяя».**
**23.10** Сёння. Вынікі.
**23.35 Серыял «Гульня».**

### 8 КАНАЛ

**7.00, 12.35, 19.10, 21.05, 23.45** «Надвор'е».
**7.05, 14.30 Серыял «Цудоўнае стагоддзе».**
**9.20, 17.40 Серыял «Касл».**
**10.45** «Кулінарныя парады».
**11.00, 19.15 Серыял «Цяжкі панядзелак».**
**12.40 Фантастыка «Зорны шлях».**
**16.10** Мультпарад.
**16.20** «Мой любімы гадаванец».
**16.50 Серыял «Каварныя пакаёўкі».**
**20.50** «Вечарніца».
**21.10** «Даведнік па краінах і кантынентах».
**21.20 Драма «Недатыкальныя».**
**23.15** Ток-шоу «Бульбокс».

### ВТБ

**6.00, 1.00** «PLAY».
**8.00, 14.00, 18.00** Скетч-шоу «6 кадраў».
**8.30, 17.30** «С.У.П.».
**9.00, 20.00 Серыял «Апошні з Магікян».**
**10.00, 19.00 Серыял «Васьмідзясятыя».**
**11.00, 22.20 Серыял «Маргоша».**
**12.00, 21.10 Серыял «Маладзёжка».**
**13.00, 16.30** Скетч-шоу «Анекдоты».
**13.30, 17.00** Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
**14.30, 23.30** «Улётнае відэа».
**15.00 Серыял «Крамлёўскія курсанты».**
**16.00, 18.30** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**0.00** «Дарожныя войны».
**0.30** «Ч.П?».

### НАСТАЛЬГІЯ

**5.00** «Эліта краіны Саветаў». Сустрэча з Аскарам Фельцманам.
**5.50** «У гасцях у М. Магамаева». 1992 год.
**6.35, 0.35 «Што такое «Ералаш»?». Маст. фільм.**
**7.45, 1.40** «Добрай ночы, малыя».
**8.00, 14.00, 20.00, 2.00** «Час».
**9.00, 15.00, 21.00, 3.00** «Народжаныя ў СССР».
**10.00** «Чатыры клоўны пад адным дахам». Фільм-канцэрт. 1985 год.
**11.00** «Музыка ў эфіры». 1988 год.
**12.05** «Як гэта назваць?». Дак. фільм.
**12.30, 18.40 «Гэтыя непаслухмяныя сыны». Маст. фільм.**
**13.35** «Паміж намі, дзяўчатамі». 1993 год.
**16.00, 22.00** «Бенефіс Ларысы Галубкінай». 1975 год.
**17.05** «Экспедыцыя ў XXI стагоддзе» «Прышэльцы ідуць на кантакт». 1988 год.
**18.05** «Перад люстэркам». 1980 год.
**23.00** «...Да 16 і старэйшым». 1992 год.
**23.50** «Чорны клан». Дак. фільм.
**4.00** «Зоркі польскай эстрады». Фільм-канцэрт. 1985 год.

### EUROSPORT

**10.30** Спорт і Ко.
**10.35** Дзюдо. Гран-пры.
**11.05, 15.00, 1.30** Шары. Адкрыты чэмпіянат Шатландыі.
**12.15** Футбол. Ліга чэмпіёнаў. Жанчыны. 1/8 фіналу. «Вольфсбург» (Германія) — «Мальмё» (Швецыя).
**13.30, 21.15** Футбол. Адборачны матч да чэмпіянату свету 2014. Іарданія — Уругвай.
**20.15** Футбол. Агляд кваліфікацыйных матчаў да чэмпіянату свету 2014.
**22.30** Байцоўскі клуб. Суперкамбат.
**0.30** Самыя моцныя людзі планеты.

### КАМЕДЫЯ

**5.00, 10.55, 17.00, 19.00, 2.05** Скетчком «Паміж намі».
**5.15, 8.00, 12.55, 16.00, 2.20** Серыял «Камп'ютаршчыкі».
**6.15** Меладрама «Больш, чым сябар».
**8.45** Меладрама «Рэальнае каханне».
**11.20** Камедыя «Дурні».
**13.50, 15.40, 20.40, 23.55, 1.50** «Камедыянты. Лепшае».
**14.10** Камедыя «Ёлкі-палкі».
**17.20** Камедыя «Спатканне».
**19.20** Камедыя «Гаварыць працэй».
**21.00** Серыял «Прападобны». 1-я серыя.
**22.10** Меладрама «Гэта старое пачуццё».
**0.10** Камедыя «Банда няўдачнікаў».
**3.25** Камедыя «Бамбіза Салман».

### ДЗІЦЯЧЫ СВЕТ

**2.00, 8.00, 14.00** Кінаальманах «Ральф, прывітанне!».
**3.10, 9.10, 15.10** М/с «Самы маленькі гном», № 1. Зборнік м/ф «Блакітнае шчаня». «Небяспечнае свавольства».
**4.00, 10.00, 16.00** М/с «Воін Сандакан. Кароль тыграў». Рускія народныя казкі. «Гусі-лебедзі». Зборнік м/ф «Дзіўнае кацяня». «Загадка».
**5.00, 11.00, 17.00** Кінааповесць «Бабулін унук». М/ф «Бабуля ўдава».
**6.30, 12.30, 18.30** М/с «Пісьмы ад Фелікса».
**7.00, 13.00, 19.00** «Урокі цётачкі Савы». Зборнік м/ф «Сардэчна запрашаем!». «Калабок». «Пра чарапаху».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**8.15, 21.20** «Апостал». Серыял.
**9.10, 18.30, 3.45** «Цудоўнае стагоддзе». Серыял.
**10.45, 17.00** «Паралельны свет». Дак. серыял.
**11.45, 16.00** «Варажбітка». Дак. серыял.
**12.45, 18.00** «Паляўнічыя на прывідаў». Дак. серыял.
**13.15, 20.20** «Зонэнтау». Серыял.
**14.15, 1.10** «Звышнатуральнае». Серыял.
**15.05, 0.20, 5.15** «Менталіст». Серыял.
**22.25** «Мільён гадоў да нашай эры 2». Маст. фільм.
**1.55** «Сапраўдная кроў». Серыял.

### ТБ1000

**5.00, 11.00** Маст. фільм «Пітэр Пэн».
**7.00** Трагікамедыя «Геніяльны тата».
**9.00** Меладрама «Святло вакол».
**13.00** Драма «Канец рамана».
**14.50** Драма «Павуцінне хлусні».
**17.15** М/ф «Гномеа і Джульета».
**19.00** Камедыя «Міс Ніхто».
**21.00** Драма «Маладая Вікторыя».
**23.00** Драма «Казкі стрыптыз-клуба».
**1.00** Меладрама «Мае чарнічныя ночы».
**2.55** Драма «Авансцэна».

### ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

**6.00** Драма «Дзесяць гадоў без права перапіскі».
**8.00** Драма «Слон».
**10.00** Камедыя «Выкрутасы».
**12.00** Драма «Дон-Кіхот».
**14.00** Драма «Доўгае шчаслівае жыццё».
**16.00** Камедыя «Іронія лёсу. Працяг».
**18.00** Трагікамедыя «Навобмацак».
**20.00** Трылер «Цёмны свет».
**22.00** Драма «Духless».
**0.00** Меладрама «Мама паняволі».
**2.05** Драма «Зямля людзей».
**4.00** Дэтэктыў «Класныя гульні».

### NATIONAL GEOGRAPHIC

**5.00, 21.00, 1.00, 4.00** Браты па зброі.
**6.00, 16.00** Каралі рыбалкі.
**7.00** Возера тысячы кайманаў.
**8.00, 13.00** Шукальнікі скарбаў.
**9.00, 14.00** Стараццелі.
**10.00** Крылаты экстрэмал.
**11.00, 23.00** Турэмныя цяжкасці.
**12.00** Золата горада-прывіда.
**15.00** Акулавы рай.
**17.00, 2.00** Затанулая субмарына фашыстаў.
**18.00** Шаша праз пекла.
**19.00** Гульні розуму.
**20.00, 0.00, 3.00** Выратавальны атрад.
**22.00** Віні Джонс: Рэальна пра Расію.

### DISCOVERY

**7.00, 16.25** Залатая ліхаманка.
**7.50** Мужчына, жанчына, прырода.
**8.40, 20.35** Як гэта ўстроена?
**9.10, 20.05, 4.45** Як гэта зроблена?
**9.35** Бітва за нерухомасць.
**10.30, 0.00** Цуды Сусвету.
**11.25, 3.55** Разбуральнікі легенд.
**12.20, 3.05** Голыя і напužаныя.
**13.15, 21.00, 5.10** Хуткія і гучныя.
**14.10, 22.00, 6.05** Махінатары.
**15.30** Хлопцы з гарматамі.
**17.20** Адпетыя рыэлтары.
**18.15** Чаму?
**19.10** Пяцёрка лепшых.
**23.00** Top Gear.
**0.55** Top Gear ЗША.
**1.50** Вершнікі пекла.
**2.40** Маланкавыя катастрофы.

■ Дзённік настаўніка

# СУБОТА БЕЗ ЗАНЯТКАЎ — ПАЛЁГКА ЦІ ДАДАТКОВЫЯ КЛОПАТЫ?

А калі палёгка, то каму?

Дзецям? Бацькам? Настаўнікам?

Ужо дзесяць гадоў (нават больш) школа жыве па наступных правілах: пяць дзён на тыдзень — заняткі; шосты, суботні дзень...

А што ў суботні дзень?

Цікавая сітуацыя зараз у школах з суботай! З аднаго боку, наведванне школы вучнямі ў гэты дзень цалкам добраахвотнае, і вучні (разам з бацькамі, вядома ж) самі павінны вырашаць: наведваць ім у гэты дзень школу ці ўсё ж заставацца дома.

З другога ж боку...

Калі ты класны кіраўнік, а твае вучні ў суботу ў школу не з'явіліся — цябе чакае сур'ёзная размова са школьнай адміністрацыяй. А калі школу ў гэты дзень знянацку наведае больш высокае начальства, сур'ёзная размова чакае ўжо самую адміністрацыю школы...

Вядома ж, бываюць розныя прычыны адсутнасці вучня ў школе ў суботу. Разам з бацькамі ён можа кудысьці паехаць у гэты дзень, яго могуць пакінуць дома для нейкіх тэрміновых сельскагаспадарчых работ (гэта ў вёсцы) ці проста для нагляду за малодшым брацікам альбо сястрычкай. І, вядома ж, класны кіраўнік павінен пра ўсё гэта быць зараней праінфармаваны, каб не здарылася такая сітуацыя: вучань у школу пайшоў, але не дайшоў. Бацькі, думаючы, што ён у школе, не хвалююцца, настаўнікі таксама спакойныя, упэўнены, што вучань чамусьці застаўся ў гэты дзень дома...

Але я зараз аб сітуацыях крышачку іншых. Калі вучань прынцыпова не жадае ў суботу ісці ў школу і бацькі яго ў гэтым падтрымліваюць. Па законе аб адукацыі і вучні, і іх бацькі маюць на гэта поўнае права...

І добра яшчэ, калі такіх вучняў адзін-два на ўсю школу. А калі іх дзясяткі, а школа да таго ж яшчэ і малакамплектная?..

Што рабіць у такой няпростай сітуацыі класнаму кіраўніку?

Прымусам і пагрозамі настаўнік дзейнічаць не павінен (хоць і такое здараецца часам). Ён павінен (і, наогул, школа павінна) зацікавіць вучня, зрабіць так, каб ён сам пажадаў наведваць школу ў суботу.

Але гэта лягчэй сказаць, чым зрабіць. Асабліва ў невялікай вясковай школцы з яе даволі абмежаванай матэрыяльнай базай. Чым там можна зацікавіць дзяцей? Экскурсіяй? Кінафільмам? Спартыўнымі спаборніцтвамі?

Пачнем з экскурсій. Выбар вясковай школы ў іх правядзенні небагаты: на прыроду, калі дазваляе надвор'е, альбо ў райцэнтр (часцей за грошы саміх вучняў). Можна яшчэ на бліжэйшую ферму ці якое іншае сельскагаспадарчае прадпрыемства, але гэтыя сельгасаб'екты вясковыя дзеці і так амаль штодзённа наведваюць, дапамагаючы бацькам.

Што ж датычыцца кінафільмаў, то, нават калі школа можа, не запрашаючы кінапракат, паказваць іх сама (а значыць, бясплатна для вучняў), фільмамі сёння дзяцей здзівіць цяжка. Гэты мы, памятаю, у дзяцінстве з нецярпеннем чакалі суботы, калі ў вясковы клуб прывязуць кіно... Цяпер жа сітуацыя зусім іншая.

Ды і як выбраць фільм, які б з аднолькавай цікавасцю глядзелі і старшакласнікі, і вучні малодшых класаў? Не будзеш жа ў малакамплектнай школе «круціць кіно» асобна для кожнай узроставай катэгорыі!

Застаецца спорт... І сапраўды, у школах па суботах абавязкова праводзяцца тыя ці іншыя спартыўныя мерапрыемствы: спаборніцтвы, эстафеты, разнастайныя гульні на свежым паветры...

Пытанне ў тым, наколькі цікавыя яны вучням? І ці не з'яўляюцца ўсе гэтыя спартыўныя мерапрыемствы крыху замаскіраванымі дадатковымі ўрокамі фізкультуры? Тым больш калі ў школе нават спартзалы сапраўднай няма...

Вядома ж, мінскім і наогул гарадскім школам у гэтым плане лягчэй. Ды там усім дзецям у суботу і прыходзіць неабавязкова. Калі, скажам, з тысячы вучняў прыйдзе сто (а гэта ўсяго толькі дзясятая частка), то і спартыўнае свята з імі можна наладзіць, і разнастайныя культурныя мерапрыемствы правесці. А калі ў школе ўсяго толькі сто вучняў? І што можна правесці з дзясятай іх часткай?

Вось і выкручваюцца настаўнікі, як могуць, толькі б прымусіць (менавіта прымусіць!) вучняў прыходзіць у школу ў суботу.

І я магу зразумець настаўнікаў (у першую чаргу, класных кіраўнікоў), што з настальгіяй успамінаюць тыя часы, калі ў суботу ў школе вяліся самыя звычайныя заняткі. І я разумею бацькоў, упэўненых, што ў суботу дзеці павінны адпачываць ад урокаў. І нават тых з іх, якія наогул лічаць суботу законным выхадным днём для сваіх чадаў. Карацей, я ўсіх іх вельмі добра магу зразумець...

Вось толькі пытанне, якое я вынес у загаловак невялікага гэтага артыкула, застаецца адкрытым...

**Генадзь АЎЛАСЕНКА**

■ Актуальна

# КЕЛІХ КОЛАМ НЕ ТАВАРЫШ

**На днях па ўсім Гродне разышлася непрыемная навіна. «Фальксваген», за рулём якога быў п'яны кіроўца, на адным са скрыжаванняў уехаў у натоўп пешаходаў. Два чалавекі ад гэтага сутыкнення пацярпелі. Аднак на вадзіцеля наезд не паўплываў. Ён проста адмовіўся спыніцца, вырашыў з'ехаць з месца здарэння, але пакаранне само знайшло яго: літаральна праз некалькі хвілін мужчына не справіўся з кіраваннем і яго аўто урэзаўся ў слуп... Падобная гісторыя яшчэ раз нагадала пра тое, наколькі небяспечныя на нашых дарогах падобныя «алкагоншчыкі». І не менш прыемна, што дзяржава сёння не проста задумваецца над гэтым, але і прымае важныя, патрэбныя меры. 24 кастрычніка стаў «днём Х» для аматараў нападпітку паганяць на аўтамабілі. Менавіта тады ўступілі ў сілу папраўкі да некаторых кодэксаў Беларусі па пытаннях узмацнення мер адказнасці за кіраванне аўтамабілем у стане ап'янення. Пра «падарункі», якія чакаюць падобных кіроўцаў, адмысловую статыстыку п'яных на дарогах «Звяздзе» распавяла Ганна БАНАДЫК, старшы інспектар па асаблівых даручэннях УДАІ МУС.**

— Сітуацыя з п'янствам у нашай краіне даволі вострая, — кажа Ганна Банадык. — І што тычыцца п'яных за рулём, адказнасць за кіраванне ў нецвярозым стане неаднаразова ўзмацнялася. У 2007 годзе, напрыклад, унеслі крымінальную адказнасць за паўторнае кіраванне нападпітку. Пазней дапушчальны ўзровень алкаголю ў крыві знізілі з 0,5 да 0,3 праміле. І нават гэтыя меры не ўплывалі на траўматызм на дарогах па віне нецвярозых кіроўцаў. Праблема насамрэч існуе. І для яе разумення прывяду наступныя лічбы. За 2011 год у нашай краіне затрымалі 52 тысячы вадзіцеляў у нецвярозым стане.



Фота Надзеі БУЖАН.

***— Гэтую лічбу можна параўнаць з насельніцтвам буйнога раённага цэнтра.***

— Цікава, што сярод іх кожны восьмы на працягу года затрымліваўся паўторна і прыцягваўся да крымінальнай адказнасці. Тым не менш былі і тыя, хто трапляўся ў 6-ы ці 7-ы раз! У сувязі з гэтым у заканадаўцаў узнікла пытанне пра тое, ці дастаткова «моцны» закон у дачыненні да падобных людзей. А таму былі прыняты наступныя рашэнні. Што тычыцца адміністрацыйнай адказнасці, істотна павялічыліся памеры штрафаў. Калі раней яны былі ад 15 да 35 базавых велічынь, цяпер — ад 50 да 100 базавых. Таксама было ўзмоцнена пакаранне ў дачыненні да так званых непапраўных кіроўцаў. Калі чалавека затрымліваюць паўторна ў нецвярозым стане, у яго канфіскуюць транспартны сродак. Трэба адзначыць, што ў выніку ДТЗ па віне п'янага кіроўцы з цяжкімі наступствамі ці адным загінулым адказнасць будзе ў выглядзе пазбаўлення волі да 7 гадоў. А калі загінулых будзе ад 2 і больш, адказнасць — да 10 гадоў пазбаўлення волі. Што да тых, каго нецвярозымі затрымалі ўпершыню, іх па-ранейшаму пазбаўляюць права кіравання ўсімі відамі транспартных сродкаў на 3 гады.

***— Варта адзначыць, што ў нецвярозых* кіроўцаў *аўтамабіль канфіскуецца незалежна ад таго, хто ўладальнік транспартнага сродку — ён ці іншы грамадзянін.***

— Безумоўна. Падобнае зроблена, бо ёсць адказнасць за перадачу транспартнага сродку. Вельмі часта бывае патуранне з боку ўладальнікаў аўто, бо яны ведаюць, што чалавек, напрыклад, прыцягваўся да адказнасці, мае пэўную слабасць. А цяпер гэты ўладальнік 10 разоў падумае аб тым, каму дае свой транспартны сродак. Выключэнне складаюць толькі тыя сродкі, калі кіроўца завалодаў аўтамабілем насуперак волі ўладальніка — напрыклад, угнаў.

***— Як лічыце, ці сталі падобныя папраўкі пэўным «цэнзарам» для тых, хто любіць «падшафэ» пакатацца на аўтамабілі?***

— Яшчэ на стадыі абмеркавання законапраекта ў нас значна панізілася як колькасць нецвярозых за рулём, так і колькасць ДТЗ па віне гэтых кіроўцаў. Калі раней затрымлівалі прыкладна 50 тысяч нецвярозых вадзіцеляў, цяпер маем крыху больш за 30 тысяч. І мы разлічваем на тое, што да канца года не выйдзем на лічбу ў 50 тысяч. Нецвярозых на дарогах стала менш. Людзі пачалі задумвацца і менш садзяцца за руль у нецвярозым стане. Падобнае тычыцца і здарэнняў на дарогах па віне нецвярозых вадзіцеляў. За 9 месяцаў здзейснена 346 ДТЗ, што на 36% менш, чым летась. Мы разлічваем, што гэтыя ўзмацненні будуць мець плён.

Варта, каб блізкія ў неабходны момант маглі затрымаць патэнцыйна п'янага вадзіцеля. Прасцей за ўсё — схаваць ключы. Ён будзе шукаць, злавацца, але ляжа і засне. Падобнае тычыцца і таго, калі нецвярозы выходзіць з кавярні, рэстарана. Адміністратар, гардэробшчык павінны запытацца, на чым ён збіраецца ехаць дадому. Апошнія два гады ў нас дзейнічае бестэрміновая акцыя «Спыні бяду — патэлефануй 102». І трэба адзначыць, што цяпер значны працэнт нецвярозых кіроўцаў затрымліваецца дзякуючы неабыякавым грамадзянам.

***— Грамадскасць успрыняла падобныя папраўкі даволі аптымістычна.***

— Мы глядзім інтэрнэт-форумы і бачым, што ўсе паставіліся даволі добра. Свядомыя людзі разумеюць, якую шкоду прыносіць п'янства за рулём. І гэтыя нормы — неабходныя і вымушаныя меры.

**Тарас ШЧЫРЫ**

■ Вынікі

# «ЛІСТАПАДЗІК» ДЛЯ ЎСЁЙ СЯМ'І



Закрыццё «Лістападзіка» ў сталічным кінатэатры «Піянер».

Асобнай увагі заслугоўвае конкурс фільмаў для дзіцячай і юнацкай аўдыторыі «Лістападзік». За апошнія тры гады «Лістападзік» істотна змяніў фармат. Цяпер у конкурсе бяруць удзел не фільмы для самых маленькіх, а якасныя стужкі для прагляду ўсёй сям'ёй. І калі якаснае так званае «дарослае» кіно яшчэ часам трапляе на вялікія экраны Беларусі, то добрага дзіцячага кіно даходзіць да нас зусім мала. Часцей за ўсё гэта амерыканскія фільмы са спрошчаным падыходам да маралі, абагульненымі вобразамі і пошлымі жартамі.

«Лістападзік» жа дае магчымасць паглядзець фільмы для ўсёй сям'і з усяго свету. А таму шчыра раю звярнуць увагу на фільмы-пераможцы «Лістападзіка-2013» (старшыня журы — Галіна Данэлія):

**Прыз за лепшы фільм для дзяцей** — «Клара і мядзведжыя таямніцы» (Швейцарыя — Германія), рэжысёр — Тобіяс Інайхен.

**Прыз за лепшы фільм для юнацтва** — «Не чакай пахвал» (Кітай — Паўднёвая Карэя), рэжысёр — Ян Цзінь.

**Прыз за лепшую дзіцячую ролю** — Лі Шучэнь, «Не чакай пахвал» (Кітай — Паўднёвая Карэя), рэжысёр — Ян Цзінь.

**Прыз за лепшую працу дарослага акцёра ў дзіцячым фільме** — Вячаслаў Паўлюць, «Кіндэрвілейскі прывід» (Беларусь), рэжысёр — Алена Турава.

**Прыз глядацкіх сімпатый «Залаты Лістападзік»** — «Кіндэрвілейскі прывід» (Беларусь), рэжысёр — Алена Турава.

**За рэжысёрскую работу** — Яўген Руман, «Падарожжа Ігара і жураўлёў» (Ізраіль — Германія — Польшча).

**За сцэнарый** — Яніс Нордс, «Мама, я цябе люблю» (Латвія — Літва).

**Прыз «Залаты Лістападзік» па выніках галасавання гледачоў прысуджаны беларускаму фільму Алены Туравай «Кіндэрвілейскі прывід».**



Фотаздымкі Марыны БЕГУНКОВАЙ.

# 20 ГАДОЎ ФЕСТЫВАЛЮ: ПАКАЗАННІ СВЕДАК...

## ...АДЛЮСТРАВАНЫ Ў КНІЗЕ КІНАКРЫТЫКА ЛЮДМІЛЫ САЯНКОВАЙ

Яна ведае фестываль ад пачатку. За два дзесяцігоддзі яго існавання Людміла Саянкова была на ім у розных іпастасях: кіравала прэс-цэнтрам, неаднаразова працавала і нават узначальвала журы розных конкурсных праграм, была госцем і нават звычайным гледачом. Але ўвесь час пільна прыглядалася да таго, што адбываецца на фестывалі і як ён уплывае на развіццё кінапрацэсу ў Беларусі, аналізавала, пісала пра яго ў розных выданнях. Вынікам назіранняў і роздумаў стала кніга: «Мінскі міжнародны кінафестываль «Лістапад»: праз 20 гадоў».



Фотаздымкі Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Кніга вядомага кінакрытыка і журналісткі Людмілы Саянковай убачыла свет да 20-годдзя «Лістапад» ў выдавецкім доме «Звязда».

Гісторыя фестывалю разглядаецца ад пачатку, ад першых крокаў, якія тады, у 1994-м, шмат каму здаваліся дзіўнымі, наіўнымі, нават смешнымі, да цяперашняга моманту, калі «Лістапад» ужо сцвердзіўся як міжнародны кінафорум. Але ўсё гэта — праз уласную душу і клопат за тое дзіцятка, якое ў Беларусі стваралі шмат людзей.



**Людміла Саянкова** распавядае:

— У гэтай кнізе паядналіся журналістыка і кінакрытыка. Я паставіла сабе за мэту абавязкова паразмаўляць з усімі тымі, хто рабіў фестываль. Першы чалавек, які быў на маім шляху, — Сяргей Арцімовіч, цяпер расійскі кінарэжысёр, прадзюсар, сцэнарыст. Менавіта яго ідэя ляжала ў аснове арганізацыі фестывалю ў Мінску. Мне было складана яго знайсці, але дапамаглі сучасныя тэхналогіі. Я вельмі хацела, каб было інтэрв'ю з Валянцінай Сцяпанавай, якая даўжэй за ўсіх кіравала фестывалем. Але, на жаль, не атрымалася. Аднак нейкая форма зносін і дыялогу з Валянцінай Сцяпанавай усё ж ёсць. Яе праца вялізная, яна зрабіла шмат для таго, каб «Лістапад» развіваўся. Я вельмі ўдзячная Аляксандры Захарэвіч, якая кіравала фестывалем адзін год. Удзячная Анжаліцы Крашэўскай, якая апошнія некалькі гадоў адказвае за арганізацыю форуму. Яна гаварыла са мной вельмі шчыра. Яшчэ адзін герой — праграмны дырэктар фестывалю Ігар Сукманаў, які яшчэ са школы быў кінаманам. Вельмі ўдзячная Ірыне Дзям'янавай, адказнай за дакументальную праграму, з якой у нас агульнае кінамінулае і кінасучаснасць. Размаўляючы з усімі гэтымі людзьмі, я зразумела адну рэч: у іх адны і тыя ж праблемы, пачынаючы з 1994 года і да 2013-га. Яны пераадольваюць адны і тыя ж бар'еры. Іх магло б быць меней, каб у нас было пачуццё нацыянальнага гонару. Фестываль вельмі важны для краіны: тут складваецца поле дыялогу. Мы знаёмімся, спазнаем адзін аднаго, глядзім новае кіно, даведваемся пра новых аўтараў. Усе хацелі б аднаго: каб ён працягваўся. Гэта наш брэнд. Таму што «Лістапад» выводзіць краіну ў сусветную культурную прастору.

Пра гэта Людміла Саянкова пісала як кінакрытык і як кінажурналіст шмат гадоў. Таму смела можна казаць, што кніга пісалася 20 гадоў. Таму што ў ёй сабраныя артыкулы і агляды, надрукаваныя ў беларускіх выданнях, у асноўным у часопісе «На экранах». Аўтар прызналася, што разам з фестывалем яна пражыла доўгае жыццё. Ён мяняўся — і яна мянялася. Але нават раннія працы вырашыла змясціць у кнізе: гэта сведкі часу.

Аднак галоўныя сведкі — людзі, якія прычыніліся да існавання фестывалю. Аўтар ідэі і першы арганізатар **Сяргей Арцімовіч** узгадвае:

— Я працаваў урачом, але нечакана для сяброў і блізкіх паступіў на рэжысёрскія курсы ў Маскве. Гэта быў той час, калі кіно амаль перасталі здымаць. Але «Беларусьфільм» заўсёды працаваў. Я ў той час жыў на два гарады: на Маскву і на Мінск. У Маскве нават пры разбураным кінапракаце фільмы, якія з'яўляліся, паказваліся на нейкіх пляцоўках. Рэшткі савецкай кінапрасторы былі завязаны на кінацэнтр. Я падумаў: трэба паказаць гэтыя фільмы ў Мінску. Шмат у каго гэта выклікала смех. Пасля доўгага хаджэння па ўсялякіх дзяржаўных і недзяржаўных установах я амаль адчаяўся, але «Белпрамбудбанк» пагадзіўся мне даць 20 тысяч долараў. Гэта бюджэт першага фестывалю «Лістапад» у 1994 годзе. Сума пайшла на квіткі і на гасцініцы... Пасля першага фестывалю адным з самых вялікіх скептыкаў сярод беларускіх артыстаў быў Расціслаў Янкоўскі. Ён казаў: «Гэта баль падчас чумы. Які фестываль, калі кіно няма?..» Я лічу яго адным з яркіх артыстаў у савецкім кіно. І вось я як прадзюсар Мінскага кінафестывалю паехаў на «Кінатаўр», дзе быў прэзідэнтам Алег Янкоўскі. Аднойчы была такая карціна: бачу, ідзе па пляжы Алег Іванавіч у белай кашулі з люлькай. Побач з ім Марк Рудзінштэйн. І Расціслаў Іванавіч з жонкай. Увесь пляж на іх развярнуўся. У мяне ўспышка: трэба і нам мець Янкоўскага ў якасці прэзідэнта. Гэта будзе вельмі правільна, будзе роднасць з галоўным фестывалем Расійскай Федэрацыі. І Расціслаў Іванавіч вельмі яркі, магутны чалавек, здольны быць на чале «Лістапад». Я вельмі рады, што ён стаў старшынёй, таму што ўсе гэтыя гады ён падтрымліваў фестываль сваім аўтарытэтам...

Такіх успамінаў шмат, як і шмат людзей, якія мелі дачыненне да «Лістапада» ў розныя перыяды. Некаторыя героі кнігі, як, напрыклад, Ірына Дзям'янава, удзячныя аўтару, што здаюцца разумнейшымі ў інтэрв'ю. Але не кожны паасобку, а ўсе разам ствараюць летапіс мінскага кінафестывалю і вобраз кінематаграфічнай Беларусі.

— Я мару пры тыя дні, калі тут будзе годна прадстаўлена беларуская праграма — не толькі дакументальнага кіно, але і ігравога, — прызналася аўтарка.

**Алесь Карлюкевіч, дырэктар — галоўны рэдактар выдавецкага дома «Звязда»,** адзначыў:

— Што ўразіла ў кнізе: досвед Людмілы Пятроўны, які тут выяўляецца, ён грунтуецца на глыбокім веданні сусветнага кінематографа. І навідавоку імкненне наблізіць да сусветнага кінематографа Беларусь.

**Ларыса ЦІМОШЫК**

ДЛЯ ЗВАРОТАЎ ZVAROT@ZVYAZDA.MINSK.BY

■ Дзякуй!

# КАБ ПОМНІЛІ...

**У сакавіку 1944 года на Рагачоўшчыне загінуў родны брат маёй свекрыві і адпаведна — родны дзядзька майго мужа, ураджэнец Бранскай вобласці Барыс Сямёнавіч Куцэнка. Прах яго, як і многіх іншых салдат, палеглых у ваколіцах, амаль праз сем дзесяцігоддзяў пасля вайны быў перанесены ў вёску Станькаў — у брацкую магілу. З часам на ёй з'явіўся помнік з прозвішчамі герояў, у тым ліку і яфрэйтара Барыса Куцэнкі.**

Для таго, каб ускласці кветкі, каб аддаць даніну памяці подзвігу дзеда, на яго магілу прыязджаў сёлета ўнук Мікалай з жонкай і ўнучка Ніна з мужам. Яны былі вельмі рады, што пабывалі на зямлі, за вызваленне якой дзядуля аддаў жыццё... А яшчэ яны прасілі перадаць шчыры дзякуй усім, хто прымаў удзел у пошуках астанкаў герояў, у іх перапахаванні. Наш агульны нізкі паклон малодшаму навуковаму супрацоўніку музея народнай славы Рагачова Вользе Апанасенка, дырэктару Станькаўскай базавай школы Аляксандру Чуху, старшыні выканкама Віктару Леаненку, спецыялісту Зінаідзе Бажанковай за павагу да нашай памяці, за дапамогу, якую яны нам аказалі.

**Ніна ШПАДАРУК, г. Рагачоў.**

■ Чалавек — чалавеку

# ЦІ ТАМ МЫ ШУКАЕМ ІСЦІНУ?

**...Успомніў блокаўскае: «А рядом у соседних столиков лакеи сонные торчат, и пьяницы с глазами кроликов «in vino veritas» кричат».**

Помню гэтае чатырохрадкоўе яшчэ са студэнцкай пары, хоць тады мы вырывалі з кантэксту толькі лацінскі радок, каб, па-першае, апраўдаць чарку-другую, а па-другое — фарсануць перад дзяўчатамі: мы, маўляў, яшчэ і латынь трохі ведаем.

Нас забаўлялі ўзгаданыя словы, бо, па сутнасці, мы былі дзецьмі, якія, як птушкі ў вырай, вылецелі ў вялікі горад на чатыры ці пяць гадкоў.

Пазней, калі выйшлі са сцен інстытута, калі сапраўды пасталелі, бо пайшлі на свой хлеб, тыя словы А. Блока не чыталі ні за якім сталом, бо ўбачылі, што п'янства — гэта сапраўднае сацыяльнае пекла, што часам віно ды гарэлка вяртаюць чалавека да самай нізкай стадыі развіцця, робяць з яго неандэртальца — паўчалавека-паўмалпу, што не ведае ні культуры, ні пісьма. А ўсё таму, што некалі паспытаў алкагольнага «кайфу».

Ён цяпер даступны, відаць, як ніколі. І, так бы мовіць, невыводны, як бульба, як збожжа... А таму марнуюцца гэтыя прадукты, каб рабіць атруту.

«Ну, ты скажаш!»

Допускаю: нехта ў штыкі прыме гэтую фразу і будзе мець рацыю, бо, мусіць, ніводная бяседа не абыходзіцца ў нас без выпіўкі. Спіртное льецца ракой на вяселлях і хаўтурах, на днях нараджэння дзяцей... Без яго не ўяўляем жыцця. І чым далей, тым страшней, як у казцы, нягледзячы на захады па знішчэнні гэтага «змея»...

А ён — не паддаецца! У яго не тры, не пяць, у яго мільёны галоў! Горш за тое — адсячэш адну, вырастае дзесяць. Ну вось, напрыклад, хто адмовіцца дастаўляць гарэлку ці віно ў самую глухую вёсачку? Бяруся сцвярджаць — ніводзін прадпрымальнік! Мы наблізілі гандаль да спажыўца. Раней нейкая бабуля магла даць аратаму за працу пяцьдзесят тысяч, за якія той мог купіць каўбасы ці цукерак жонцы альбо дзіцяці... Цяпер у якасці разліку — пляшка гарэлкі ці дзве «чарніла».

Яго ды іншых напіткаў цяпер хоць заліся! І ўсе нашы спробы звесці іх толькі на момант збіваюць полымя, каб праз нейкі час яно разгарэлася з новай, яшчэ большай сілай. Не памятаю, каб раней было столькі жанчын-алкагалічак: ссінелыя, з дрыжачымі рукамі і растрапанымі валасамі — іх цяпер больш, чым пудзілаў ва ўсіх агародах. Людзі становяцца вар'ятамі, прычым па сваёй жа ахвоце.

Ёсць думка, што трэба перайсці на вінаградныя натуральныя віны. Але ж гэта калі яшчэ будзе, калі будзе наогул. А пакуль — калечымся, гінем, атручваем жыццё сваіх блізкіх і не можам спыніцца, каб падумаць, ці там мы шукаем ісціну.

**Мікалай МАРОЗ, г. Шуміліна**

■ Пасля пісьма

# «НЕ ДУМАЛІ, ШТО ЎБАЧЫМ СВОЙ ПЕРАХОД... НОВЫМ!»

**Тры тыдні таму, быўшы, што называецца, пад уражаннем, я напісала ў рэдакцыю «Звязды» пра тое, як доўга мы, сталыя жыхары мікрараёна Серабранка, чакалі, пакуль на скрыжаванні нашых галоўных вуліц пабудуюць падземны пераход, як радаваліся, калі яго нарэшце адкрылі, і як засмуціліся потым. Бо ўсяго праз два месяцы нашу новабудоўлю стала не пазнаць: нейкія «мастакі», нягледзячы на, як быццам, наяўнасць відэаназірання, размалявалі ўсе сцены... А бруд і смецце там наогул, здавалася, не прыбіраў ніхто.**

Не думала, што мой ліст будзе надрукаваны («Звязда», 26 кастрычніка). І тым больш не чакала, што ўсяго праз тыдзень пасля публікацыі мы зноў убачым свой пераход... новым! Адмыліся (няцяжка ўявіць, чаго гэта каштавала!) каракулі на сценах, запанавала.

Не ведаю, ці надоўга хопіць гэтага наведзенага некім парадку, бо аматараў і «мастакоў» нашкодзіць у нас вельмі шмат, асабліва — сярод неразумных падлеткаў, дзяцей. Мне здаецца, што бацькі, выхавальнікі дзіцячых садкоў і настаўнікі цяпер мала размаўляюць з імі, не прымушаюць працаваць і не вучаць паважаць працу іншых. А гэта ж, мне здаецца, нескладана — разам палюбавацца прыгажосцю, парадкам і чысцінёй. Альбо наадварот — звярнуць увагу дзіцяці, дзяцей на тое, як жа непрыемна ехаць у брудным ліфце, ісці па засмечаных вуліцах ці размаляваным пераходзе.

Хочацца верыць, што наш такім болей не будзе, што нехта ў ім усё ж будзе сачыць за парадкам.

**А. ГЛІНСКАЯ, г. Мінск**

■ Кватэрнае пытанне

# УЛАСНІК — ГЭТА АДНО... А НАЙМАЛЬНІК...

***Кажуць, што з прыняццем новага Жыллёвага кодэкса грамадзяне, якія не прыватызавалі сваё жыллё, акрамя платы за тэхнічнае абслугоўванне жылога дома, будуць плаціць яшчэ і за карыстанне жылым памяшканнем? Ці праўда гэта? І цікава, колькі?***

**Г. Рыбак,** *Мінскі раён.*

Так, згодна з п.3 арт.29 Жыллёвага кодэкса Рэспублікі Беларусь (уступіў у сілу з 2 сакавіка 2013 г.) наймальнік жылога памяшкання дзяржаўнага жыллёвага фонду, акрамя абавязку ўнясення платы за жыллёва-камунальныя паслугі, нясе абавязак унясення платы за карыстанне жылым памяшканнем з дня заключэння дагавора найму жылога памяшкання дзяржаўнага жыллёвага фонду.

У адпаведнасці з пастановай Савета Міністраў ад 19 сакавіка 2013 г. № 193 «Аб зацвярджэнні тыпавых дагавораў найму і паднайму жылога памяшкання дзяржаўнага жыллёвага фонду, унясенні змяненняў у пастанову Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 12 верасня 2006 года № 1191 і прызнанні страціўшымі сілу пастановы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 17 сакавіка 2006 г. № 371 і асобных структурных элементаў пастаноў Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь», жыхары кватэр, не афармленых ва ўласнасць, акрамя жыллёва-камунальных паслуг, абавязаны ўносіць плату за карыстанне жылым памяшканнем у тэрміны, памерах і на ўмовах, вызначаных заканадаўствам. Памер платы за карыстанне жылым памяшканнем пакуль яшчэ не вызначаны.

ДЛЯ ЗВАРОТАЎ ZVAROT@ZVYAZDA.MINSK.BY

Дарагой дачушцы, унучцы **Вользе ЛЫСЮК** з Гомеля наша шчырае віншаванне з нагоды 18-годдзя і пажаданне добрага здароўя, паспяховай вучобы, сонечнага зямнога шчасця. Няхай Бог аберагае цябе.

**Мама, дзядуля, бабуля.**

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

### ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| ЛОТ 1 | |
| Наименование объекта, краткая характеристика | **Капитальное строение, инв. № 452/С-6011 (назначение – здание неустановленного назначения, наименование – здание сарая), площадью 136,4 кв.м** |
| Местонахождение объекта | Гродненская область, Зельвенский р-н, г.п. Зельва, ул. Чапаева, д. 7 |
| Земельный участок | Кадастровый номер 422655100001001694, площадью 0,0940 га |
| Начальная цена продажи | 60 206 400 (шестьдесят миллионов двести шесть тысяч четыреста) белорусских рублей с учетом НДС |
| Сумма задатка | 6 020 640 (шесть миллионов двадцать тысяч шестьсот сорок) белорусских рублей |
| Продавец | Волковысское ОАО «Беллакт», г. Волковыск, ул. Октябрьская, 133, тел. 8-01512-515-83 |
| Организатор торгов | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 41-98-34 |
| Условия аукциона | Без условий |
| Условия оплаты | По договоренности сторон |
| Срок заключения договора купли-продажи | Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| Номер р/с для перечисления задатка | р/с 301 257 917 0017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, БИК 153001739, УНП 500833225. |

**Аукцион состоится 21 ноября 2013 г. в 13.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209.**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

*юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;

*индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;

*юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:

представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;

физическим лицам - документ, удостоверяющий личность физического лица; представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

**Извещение о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 20.09.2013 г. № 177 (27542).**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30.**

**Последний день приема заявлений – 18 ноября 2013 г. до 15.00.**

**Телефон для справок: 41 98 32, 41 98 34 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки».**

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

### ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| ЛОТ 1 | |
| Наименование объекта, краткая характеристика | **Капитальное строение, инв. № 413/С-18368 (наименование – здание молокоприемного пункта), площадью 274 кв.м, 1949 года постройки** |
| Местонахождение объекта | г. Свислочь, ул. Комсомольская, д. 35 |
| Земельный участок | Кадастровый номер 425250100001001767, площадью 0,3581 га, назначение – эксплуатация и обслуживание здания в г.п. Свислочь, ул. Комсомольская |
| Начальная цена продажи | 84 405 468 (восемьдесят четыре миллиона четыреста пять тысяч четыреста шестьдесят восемь) белорусских рублей с учетом НДС |
| Сумма задатка | 8 440 550 (восемь миллионов четыреста сорок тысяч пятьсот пятьдесят) белорусских рублей |
| Продавец | Волковысское ОАО «Беллакт», г. Волковыск, ул. Октябрьская, 133, тел. 8-01512-515-83 |
| Организатор торгов | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 41-98-32, 41-98-34 |
| Условия аукциона | Без условий |
| Условия оплаты | По договоренности сторон |
| Срок заключения договора купли-продажи | Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| Номер р/с для перечисления задатка | р/с 301 257 917 0017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, БИК 153001739, УНП 500833225. |

**Аукцион состоится 21 ноября 2013 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209.**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

*юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;

*индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;

*юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:

представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;

физическим лицам – документ, удостоверяющий личность физического лица; представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

**Извещение о проведении первого аукциона было опубликовано в «Народной газете» от 28.03.2013 г. № 57.**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30.**

**Последний день приема заявлений – 18 ноября 2013 г. до 15.00.**

**Телефон для справок: 41-98-32, 41-98-34 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки».**

УНП 300077196

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

### по продаже в частную собственность земельного участка для строительства и обслуживания жилых домов в д. Мицкяны, д. Саранчаны, д. Поповцы Поставского района Витебской области

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| **Дата, время, место проведения аукциона** | **10 декабря 2013 года в 10.00 в здании райисполкома (г. Поставы, пл. Ленина, 25, 3-й этаж, каб. № 58)** | | | | | |
| **Адрес, площадь, кадастровый номер земельного участка, начальная цена** | **№ п/п** | **Адрес участка** | **Площадь, га** | **Кадастровый номер** | **Наличие ограничений в использовании** | **Начальная цена, рублей** |
| | 1. | Лынтупский сельисполком д. Мицкяны, ул. Озерная, 4А | 0,25 | 224082815301000021 | водоохранная зона озера М. Швакшты | 15000000 рублей |
| | 2. | Лынтупский сельисполком д. Саранчаны, ул. Строителей, 15Г | 0,2456 | 224082824301000056 | водоохранная зона озера Саранчаны | 15000000 рублей |
| | 3. | Лынтупский сельисполком д. Поповцы, ул. Тихая, 17 | 0,25 | 224082807101000030 | водоохранная зона озера М. Швакшты | 15000000 рублей |
| **Условия, предусмотренные в решении об изъятии земельных участков для проведения аукциона** | внесение победителем аукциона в местный бюджет платы за право частной собственности на земельный участок в размере, заявленном на торгах; возмещение Лынтупскому сельисполкому расходов, связанных с проведением аукциона и формированием земельных участков, в том числе с государственной регистрацией в отношении создания земельного участка; государственная регистрация права на земельный участок в двухмесячный срок со дня принятия решения исполкома о предоставлении земельного участка; получение победителем аукциона в установленном порядке технической документации и разрешения на строительство жилого дома; занятие (освоение) земельного участка не позднее одного года после получения свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации | | | | | |
| **Порядок осмотра на местности земельного участка, который предполагается предоставить в частную собственность по результатам аукциона** | В рабочие дни с 8.00 до 17.00 по мере обращений лиц, заинтересованных в участии в аукционе. Обращаться в землеустроительную службу Поставского райисполкома г. Поставы, пл. Ленина, 25, здание райисполкома, 1-й этаж, каб. 11,а также в Лынтупский сельисполком, г.п. Лынтупы, ул. Голубкова, 44А | | | | | |
| **Перечень документов, которые необходимо представить участникам аукциона до его начала** | - заявление на участие в аукционе (бланк можно получить и заполнить непосредственно в землеустроительной службе);<br>- квитанция об уплате задатка;<br>- ксерокопия стр. 25, 31, 32, 33 общегражданского паспорта без нотариального засвидетельствования;<br>- представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность;<br>- представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица – доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих гос. регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица | | | | | |
| **Место, дата и время начала и окончания приема заявлений** | г. Поставы, пл. Ленина, 25 здание райисполкома,1-й этаж, каб. № 11, в рабочие дни с 8.00 до 17.00 а также г.п. Лынтупы, ул. Голубкова, 44а, здание сельисполкома, 2-й этаж со дня публикации извещения до 06.12.2013 включительно. | | | | | |
| **Размер задатка, срок и порядок его внесения** | 10% от начальной цены соответствующего участка до подачи заявления на счет Лынтупского сельисполкома. Реквизиты платежа указаны в бланке заявления на участие в аукционе. | | | | | |
| **Адрес и номер контактного телефона комиссии** | г. Поставы, пл. Ленина, 25, здание райисполкома,1-й этаж, каб. № 11,в рабочие дни с 8.00 до 17.00 (перерыв на обед с 13.00 до 14.00), телефоны: 8(02155)43180, 41132, 58828 | | | | | |

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА**

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Нестановичи-Агро» (продавец)**

проводит открытый аукцион по продаже

## здания ремонтной мастерской

**(здание для ремонта и технического обслуживания автомобилей, в т.ч. автомобильные заправочные и газонаполнительные станции), общей площадью 1954.0 кв.м** (инв. № 601/С-22624), расположенного на земельном участке площадью **0,5332 га** (предоставлен продавцу на праве постоянного пользования) **по адресу: Минская область, г. Логойск, ул. Победы, 86, корп. 4.**

Начальная цена с НДС – 2 942 400 000 бел. руб.

**Задаток 10% от начальной цены (294 240 000 бел. руб.) перечисляется на р/с № 3012108260016 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, код 369, УНН 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 10 (десяти) банковских дней со дня проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель торгов (покупатель).

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by.**

Аукцион состоится **10.12.2013 в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **09.12.2013 до 12:00** по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 224 61 34, (8029) 102 21 17.**

**ОАО «Дзержинский экспериментально-механический завод» ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН ПО ПРОДАЖЕ ОБОРУДОВАНИЯ**

| № лота | Наименование | Начальная цена с НДС, руб. РБ |
|---|---|---|
| 1 | Станок токарный 16К20 | 22 189 536 |
| 2 | Станок токарный 1В62Г | 23 589 000 |
| 3 | Станок токарный 16К20 | 25 634 280 |

*Задаток в размере 10% от начальной цены перечисляется на р/с 3012060604003 в ЦБУ № 606 ф-л Минского управления ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Дзержинска, ул К. Маркса, 17, МФО 153001601, УНП 600004946, ОКПО 05550337.*

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 5 дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.

**Аукцион состоится 10 декабря 2013 г. в 14.00 по адресу: Минская обл., г. Дзержинск, ул. Фоминых, 46.**

Заявление на участие и необходимые документы принимаются по 9 декабря до 16.30 по указанному адресу.

Контактные телефоны: 8 (044) 554-44-78, 8 (01716) 6-43-27, 8 (01716) 5-69-24.

Сайт в интернете: **www.demz.by**

**В опубликованную проектную декларацию по объекту: «Многоквартирные жилые дома № 8 по г/п и № 9 по г/п в квартале пр. Победителей – ул. Проектируемая № 3 – ул. 4-ое Кольцо – ул. Нарочанская в жилом районе «Лебяжий» в газете «Звязда» № 36 от 23.02.2013 г.**

**ВНЕСТИ СЛЕДУЮЩИЕ ИЗМЕНЕНИЯ:**

Для привлечения дольщиков к строительству по договорам создания долевого строительства предлагаются для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, юридических лиц:

однокомнатные – общей площадью 42,88 м² – 39 квартир;

двухкомнатные – общей площадью от 62,71 м² до 74,10 м² – 86 квартир;

трехкомнатные – общей площадью от 94,86 м² до 112,84 м² – 101 квартира;

четырехкомнатные – общей площадью от 131,91 м² до 139,9 м² – 8 квартир.

Застройщик: Общество с ограниченной ответственностью «БЕЛИНВЕСТ-инжиниринг», зарегистрировано Минским горисполкомом от 01.06.2012 г. № 0042025 в едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 191450284.

**Ознакомление дольщиков с планировками объекта долевого строительства осуществляется в рабочее время ООО «БЕЛИНВЕСТ-инжиниринг» по адресу: г. Минск, ул. Мельникайте, 2, п.7 (№1508). Контактный тел.: 8 (017) 226 43 99, 8 (029) 314 11 14.**

Уполномоченный представитель по вопросам долевого строительства – директор Валерий Иванович Самущик, действует на основании Устава.

## ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

### Подземная двухуровневая гараж-стоянка в составе объекта «Многоквартирные жилые дома № 8 по г/п и № 9 по г/п в квартале пр. Победителей – ул. Проектируемая № 3 – ул. 4-ое Кольцо – ул. Нарочанская в жилом районе «Лебяжий»

**Застройщик:** Общество с ограниченной ответственностью «БЕЛИНВЕСТ-инжиниринг», зарегистрировано Минским горисполкомом от 01.06.2012 г. № 0042025 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 191450284.

Юридический адрес: Республика Беларусь, 220004, г. Минск, ул. Мельникайте, 2, п.7 (№1508).

Режим работы по вопросам долевого строительства: понедельник – четверг с 9.00 до 17.30; пятница 9.00 – 16.00; обед с 13.00 до 14.00, выходные дни – суббота, воскресенье.

В течение трех предшествующих лет ООО «БЕЛИНВЕСТ-инжиниринг» строительство не осуществляло.

**Информация о проекте строительства.**

**Цель строительства** – строительство подземной двухуровневой гаража-стоянки.

На первом уровне на отметке -6.000 (уровень пр. Победителей) запроектировано 130 машино-мест.

На втором уровне на отметке -3.000 запроектировано 116 машино-мест.

Начало строительства: 28 февраля 2012 года, окончание строительства – III-квартал 2014 года.

Застройщиком получены:

- заключение государственной экспертизы (РУП «Главгосстройэкспертиза») архитектурного проекта с рекомендацией к утверждению проекта № 1217-15/11 от 10.02.2012 г.

- решение Минского городского исполнительного комитета № 3663 от 08 декабря 2011 года «Об изъятии, предоставлении земельных участков, разрешении строительства и внесении изменения в решение Мингорисполкома»;

- свидетельство (удостоверение) № 500/654-3240 о государственной регистрации на право временного пользования на земельный участок с кадастровым номером 500000000007006004, расположенный по адресу: г. Минск, квартал пр. Победителей – ул. Проектируемая № 3 – ул. 4-е Кольцо – ул. Нарочанская, площадью 2,7720 га для строительства объекта «Многоквартирные жилые дома № 8 по г/п и № 9 по г/п в квартале пр. Победителей – ул. Проектируемая № 3 – ул. 4-ое Кольцо – ул. Нарочанская в жилом районе «Лебяжий»;

- разрешение на производство строительно-монтажных работ № 2-209Ж-008/12 от 28.02.2012 г.

Генеральный подрядчик ООО «Монолит Групп». Договор строительного подряда № 99-12/11 от 17.01.2012 г.

В гараже-стоянке предусмотрены на каждом уровне по два рассредоточенных въезда-выезда, кровля гаража-стоянки будет эксплуатируемой. С каждого уровня будет пять эвакуационных выходов. Внутренняя отделка стен и перегородок – штукатурка с клеевой окраской и известковой побелкой.

Потолки покрыты известковой побелкой. Покрытие пола – бетонное безискровое.

Вся территория благоустраивается и озеленяется за счет организации подъездов, проездов и автостоянок, формирования сети пешеходных тротуаров, дорожек и аллей, площадок, устройства подпорных стенок и наружных лестниц, создания декоративно-ландшафтных композиций, расстановки малых архитектурных форм.

**Для юридических и физических лиц, а так же индивидуальных предпринимателей к строительству по договорам создания объектов долевого строительства предлагаются 130 машино-мест в гараже-стоянке на первом уровне (отм. -6.000) следующего целевого назначения:**

**Хранение автомобилей с двигателями, работающими на бензине, дизельном топливе. Хранение автомобилей на сжиженном углеводородном газе запрещено.**

**Стоимость машино-места эквивалентна долларам США в белорусских рублях по курсу НБ РБ и составляет 23 243 доллара США.**

Цена машино-места является фиксированной и неизменной. Оплата за машино-место производится дольщиком единовременно.

**Ознакомление дольщиков с планировками объекта долевого строительства, осуществляется в рабочее время ООО «БЕЛИНВЕСТ-инжиниринг»» по адресу: г. Минск, ул. Мельникайте, 2, п.7 (№1508). Контактный тел.: 8 (017) 226 43 99, 8 (029) 314 11 14.**

Уполномоченный представитель по вопросам долевого строительства – директор Валерий Иванович Самущик, действует на основании Устава.

## ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

### по объекту: «Реконструкция жилого дома № 4 по ул. Д. Сердича с надстройкой мансардного этажа»

Унитарное предприятие «Белоир» Общественного объединения «Белорусское общество инвалидов «Реабилитация» информирует юридических и физических лиц о создании объекта долевого строительства.

**Заказчик-Застройщик** – УП «Белоир» ОО БОИ «Реабилитация» зарегистрировано Минским горисполкомом решение № 739 от 5 июня 2001 года в едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 100195041. Юридический адрес: 220006, г. Минск, ул. Маяковского, 18, к. 9.

Режим работы: понедельник – четверг с 9.30 до 17.00, пятница с 9.30 до 16.00, обед с 13.00 до 13.45, выходные дни – суббота, воскресенье.

В течение предыдущих трех лет организацией строительство не осуществлялось.

Функции заказчика осуществляются собственными силами.

**Информация о проекте строительства:**

**Цель строительства** – реализация проекта по договору № С-4 от10 июня 2010 г. о реализации права проектирования и строительства объекта «Реконструкция жилого дома № 4 по ул. Сердича в г. Минске, с надстройкой мансардного этажа» с УП «ЖРЭО № 2 Фрунзенского района г. Минска».

**Объект долевого строительства** – надстройка мансардного этажа с квартирами типовых потребительских качеств общей площадью – 1599,3 кв.м. Нормативная продолжительность строительства 8,5 мес. Проект реконструкции жилого дома с надстройкой мансардного этажа разработан с учетом проекта капитального ремонта жилого дома. Все архитектурные, конструктивные и инженерные решения увязаны для всего сооружения в целом.

Реконструкция осуществляется за счет средств физических и юридических лиц.

Начало строительства объекта – 2-й квартал 2012 года.

Окончание строительства – 4-й квартал 2013 г.

Месторасположение объекта – Фрунзенский район г. Минска, ул. Сердича, дом № 4.

**Состав общего имущества**: Межквартирные лестничные клетки, лестницы, крыши, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых помещений, элементы озеленения и благоустройства.

Для привлечения физических лиц и юридических лиц к строительству по договорам создания объекта долевого строительства в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 6 июня 2013 г. № 263, по состоянию на дату опубликования проектной декларации, предлагается 2 (две) квартиры, в т.ч.:

- трехкомнатных — общей площадью 60,0 кв.м – 2 квартиры.

Стоимость строительства для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, – 14 768 000 (четырнадцать миллионов семьсот шестьдесят восемь тысяч) белорусских рублей за 1 кв.м, что эквивалентно 1600 долларам США по курсу Национального банка Республики Беларусь на дату публикации проектной декларации. Цена объекта долевого строительства является неизменной в долларовом эквиваленте на весь период строительства.

Отделка квартир не выполняется.

Указанная в настоящей проектной декларации цена за 1 кв.м общей площади квартир и их количество считается действительной до момента опубликования новой проектной декларации.

**Застройщиком получены:**

- Акт выбора места размещения земельного участка для строительства Минского городского исполнительного комитета от 16.03. 2010 г.;

- заключение РУП «Госстройэкспертиза по г. Минску» № 474-60/11 от 28 июня 2011 г.;

- решение МГИ от 15 марта 2012 г. № 769 о разрешении строительства.

**Сведения о договорах подряда:**

Договор строительного подряда от 20.03.2012 г. № С-4-01, заключенный с ОДО «Стройтехоснова»;

Договор строительного подряда № 30-05/13 от 30.05.2013 г., заключенный с ЧСУП «БелоирСтрой».

**Информацию по объекту долевого строительства и условиям заключения договоров можно получить по тел.: (029)130-22-04; (017) 223-58-72.**

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА НА ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ**

## Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации»

## 13 декабря 2013 года проводит открытый аукцион на право заключения договоров аренды земельных участков в Минском районе

**Вид аукциона:** открытый (на повышение начальной цены). Предмет аукциона: право заключения договора аренды земельного участка. Аукцион проводится в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462.

| | | Лот 1 | Лот 2 | Лот 3 | Лот 4 | Лот 5 | Лот 6 | Лот 7 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Адрес земельного участка | Минский район, Ждановичский с/с, аг. Ратомка, ул. Зеленая | Минский район, Крупицкий с/с, д. Дубицкая Слобода | Минский район, Острошицко-Городокский с/с, д. Галица | Минский район, Крупицкий с/с, д. Пятевщина | Минский район, Заславский г/и, г. Заславль, ул. Путейко | Минский район, Заславский г/и, г. Заславль, ул. Великая | Минский район, Заславский г/и, г. Заславль, ул. Советская |
| 2 | Кадастровый номер | 623681708601002821 | 623683903601000064 | 623685202101000147 | 623683908101000385 | 623650100001004679 | 623650100001004680 | 623650100001004677 |
| 3 | Площадь земельного участка, га | 0,0217 | 0,0386 | 0,1200 | 0,9738 | 0,0071 | 0,0043 | 0,0040 |
| 4 | Срок аренды (лет) | 30 | 30 | 30 | 30 | 20 | 20 | 20 |
| 5 | Целевое назначение | Для установки павильона по ремонту обуви | Для размещения объекта торговли товарами народного потребления | Для строительства магазина | Для строительства кафе-ресторана | Для установки и обслуживания торгового павильона | Для установки и обслуживания торгового павильона | Для установки и обслуживания торгового павильона |
| 6 | Инженерная инфраструктура * | электричество, газ | – | электричество, водоснабжение | электричество, газ, водопровод | электричество | электричество | электричество |
| 7 | Условия, предусмотренные в решении Минского райисполкома об изъятии земельного участка для проведения аукциона, и иные условия аукциона | – | Возмещение потерь сельскохозяйственного производства в размере 1 003 438 руб. | Возмещение потерь сельскохозяйственного производства в размере 8 469 631 руб. | – | – | – | – |
| 8 | Расходы по подготовке документации (рублей) | 4 824 235 | 2 156 134 | 2 135 869 | 9 138 052 | 5 445 954 | 5 445 954 | 5 445 954 |
| 9 | Начальная цена права заключения договора аренды (дол. США) | 2 456,37 | 725,19 | 4 812,98 | 32 577,90 | 476,12 | 814,91 | 487,56 |
| 10 | Задаток (бел. руб.) | 2 179 560 | 646 780 | 4 261 660 | 28 865 800 | 426 000 | 729 000 | 436 000 |
| 11 | Ограничения (обременения) прав на земельный участок | Водоохранная зона Заславского водохранилища вне прибрежной полосы, зона отдыха «Минское море», охранная зона ЛЭП | – | Контролируемая зона автомобильной дороги Н-9037 | Контролируемая зона автомобильной дороги Р-23 | Водоохранная зона Заславского водохранилища вне прибрежной полосы, охранная зона ЛЭП | Водоохранная зона Заславского водохранилища вне прибрежной полосы | Водоохранная зона Заславского водохранилища вне прибрежной полосы |

| | | Лот 8 | Лот 9 | Лот 10 | Лот 11 | Лот 12 | Лот 13 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Адрес земельного участка | Минский район, Папернянский с/с, район д. Паперня | Минский район, Колодищанский с/с, аг. Колодищи | Минский район, Папернянский с/с, аг. Большевик | Минский район, Петришковский с/с, аг. Петришки | Минский район, Михановичский с/с, д. Серафимово | Минский район, Луговослободской с/с, аг. Луговая Слобода |
| 2 | Кадастровый номер | 623685500001001012 | 623683403101007560 | 623685501101000652 | 623685707601000757 | 623684206101000326 | 623684108601000502 |
| 3 | Площадь земельного участка, га | 1,4030 | 0,1500 | 0,5000 | 0,0266 | 0,0516 | 0,0030 |
| 4 | Срок аренды (лет) | 30 | 50 | 30 | 30 | 30 | 30 |
| 5 | Целевое назначение | Для строительства и обслуживания производственной базы | Для строительства производственной базы и цеха по изготовлению металлоконструкций и электротехнической продукции | Для строительства производственно-складской базы | Для строительства центра энергосберегающих технологий | Для строительства станции технического обслуживания | Для строительства торгового объекта |
| 6 | Инженерная инфраструктура * | электричество | электричество | электричество | электричество | электричество | электричество |
| 7 | Условия, предусмотренные в решении Минского райисполкома об изъятии земельного участка для проведения аукциона и иные условия аукциона | – | – | – | – | – | – |
| 8 | Расходы по подготовке документации (рублей) | 10 034 653 | 8 408 337 | 6 312 679 | 8 562 916 | 7 798 680 | 5 876 719 |
| 9 | Начальная цена права заключения договора аренды (дол. США) | 70 897,07 | 18 648,54 | 80 473,90 | 1 343,05 | 3 105,97 | 218,96 |
| 10 | Задаток (бел. руб.) | 65 297 000 | 17 176 000 | 74 117 000 | 1 237 000 | 2 861 000 | 200 000 |
| 11 | Ограничения (обременения) прав на земельный участок | Водоохранная зона р. Вяча, третий пояс зоны санитарной охраны водозабора Новинки г. Минска, контролируемая полоса подъезда а/д КУП «Минскоблдорстрой», охранная зона ЛЭП | Охранная зона кабельной линии связи и радиофикации | Зона санитарной охраны водозабора «Новинки» | Водоохранная зона Вилейско-Минской водной системы | – | Третий пояс зоны санитарной охраны водозабора «Фелицианово» г. Минска |

**В разделе «инженерная инфраструктура» указаны коммуникации, к которым возможно подключение в указанном населенном пункте.*

**Аукцион состоится 13 декабря 2013 года в 13.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.**

**Прием документов, консультации по вопросам участия в аукционе и ознакомление с имеющейся документацией осуществляются по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324, по 9 декабря 2013 г. включительно в рабочие дни с 08.30 до 17.00.**

**Условия проведения аукциона размещены на официальном сайте организатора торгов: www.rlt.by.**

**Контактный телефон: + 375 (17) 205-46-91, +375 (17) 224-61-34, +375 (29) 102-21-17, +375 (29) 111-70-82**

**Задатки перечисляются не позднее 9 декабря 2013 г.:**

**(Лоты 1, 2, 3, 4, 8, 9, 10, 11, 12, 13)** на расчетный счет № 3641000000223, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Карбышева, д. 13, к. 2, МФО 153001520, УНП 600068187, получатель – Минский районный исполнительный комитет.

**(Лоты 5, 6, 7)** на расчетный счет № 3641621200079, филиал № 614 ОАО«АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Карбышева, д. 13, к. 2, УНП 600012999, код платежа 04901, получатель – Заславский городской исполнительный комитет.



Фота слова
Яўгена ПЯСЕЦКАГА

*Плыве у рай падманутае лісце.*
*Яму казалі, што цячэ рака*
*Туды, дзе доля знойдзецца калісьці*
*І золатам засыпле бедняка.*
*Казалі, ў тым краі вясна чакае*
*І кожны стане маладым лістком*
*(але у снежні рэчка замярзае,*
*хаваючы надзеі пад ільдом).*
*Хай не крануць завейныя нягоды*
*Ні чоўна, ні маленькага лістка...*
*Плывуць у рай асеннія чароды,*
*І вабіць нас халодная рака.*

## Эніа МАРЫКОНЭ:
# «СІЛЫ МНЕ ДАЮЦЬ ВЫНІКІ ЎЛАСНАЙ ПРАЦЫ»



**Творчая біяграфія Эніа Марыконэ налічвае каля 500 музычных кампазіцый да фільмаў і 100 твораў «чыстай» музыкі, якую ён піша, так бы мовіць, для сябе. Вядомы італьянскі кампазітар наведаў Мінск з праграмай «Лепшае за ўсё жыццё». Напярэдадні канцэрта маэстра расказаў журналістам пра свае музычныя густы, супрацоўніцтва з рэжысёрамі і ўласны сакрэт натхнення.**

Напісанне музыкі — праца не з лёгкіх, тым больш калі яна пішацца «на заказ». Усім вядомыя кампазіцыі з фільмаў «Аднойчы ў Амерыцы», «Прафесіянал», серыяла «Спрут» і многіх іншых прынеслі кампазітару сусветную папулярнасць. Аднак сам ён заначае: «Калі мне дрэнна працуецца з рэжысёрам, то я з ім проста не працую. Пры наяўнасці добрых адносін мы супрацоўнічаем. Але ёсць рэжысёры, з якімі я працую больш ахвотна, і гэта тыя, хто разбіраецца ў музыцы. Бывае і так, што рэжысёр мае ўяўленне, якая музыка яму патрэбна, аднак не хоча разумець, што я магу прапанаваць. Здараюцца часам праблемы».

Эніа Марыконэ спакойна рэагуе на тое, што некаторыя звяртаюцца да напісанай ім музыкі, каб стварыць нешта сваё. «Я цаню такую працу. Ведаю, ёсць музыканты, якія інтэрпрэтуюць маю музыку. Лічу, так яны выказваюць сваю павагу да маёй працы».

Маэстра шмат падарожнічае, таму не бачыць падставы крытыкаваць тых людзей, якія ў наш час перыядычна змяняюць месца працы і краіну пражывання. «Калі такія перамяшчэнні дапамагаюць узбагачаць культурна, то стаўленне да іх не можа быць крытычным. Аднак мне здаецца, што, мабыць, з гэтых людзей мала працы. Таму што я не магу сябе ўявіць на іх месцы: мне даводзіцца працаваць шмат часу за пісьмовым сталом. Мой працоўны дзень пачынаецца вельмі рана. Прачнуўшыся, я займаюся гімнастыкай, потым іду купляць газеты. А восьмай ці а палове дзявятай ужо сяджу за працоўным сталом. І працую да вечара альбо часам толькі да абеду». Што цікава, у існаванне натхнення кампазітар не верыць: «Для мяне не існуе паняцця «натхненне». Яно — проста рамантычная ідэя. Ёсць праца, досвед, кампазітары, якія я слухаю, і мне гэта дапамагае. Веды акумулююцца — і ствараецца нешта новае. Я не стараюся нікога паўтараць як кампазітар, а імкнуся рабіць нешта сваё. Сілы мне даюць вынікі ўласнай працы, людзі, якія ведаюць мяне ва ўсім свеце і любяць маю музыку».

Сам ён захапляецца Стравінскім, Рымскім-Корсакавым і іншымі кампазітарамі, але, каб паслухаць музычныя творы, наведвае канцэрты, а дома часцей слухае ўласную музыку, каб ацаніць якасць прадукту, які ўбачыць свет. «Мне падабаюцца кампазітары, якія эксперыментуюць. Я некалі быў у гурце, які граў эксперыментальную музыку. І на канцэртах мы імправізавалі. Аднак для імправізацыі трэба шмат вучыцца».

Спадар Марыконэ, які працуе і як дырыжор, таксама патлумачыў сваю патрабавальнасць у працы з аркестрам: «Кампазітар, калі піша музыку, то закладвае ў яе пэўны вобраз. І тут адбываецца вельмі складаны працэс. Думкі пераходзяць на паперу, потым праз інструменты ў гуках даходзяць да слухача. Вельмі важна не страціць першапачатковы вобраз, які ўзнікае ў галаве, і данесці яго да гледача. Я патрабавальны да сябе, і такое ж маё стаўленне да людзей, якія выконваюць маю музыку. Зусім не факт, што музыка, якую напісаў Бетховен, — ёсць сапраўднае адлюстраванне таго, што кампазітар хацеў выказаць. Калі, напрыклад, мастак напісаў карціну, то мы адразу бачым вынік яго працы. А музыка даходзіць да аўдыторыі праз гучанне інструментаў у аркестры, успрымаецца на слых, што ў пэўнай меры больш складана, чым глядзець карціну».

«Адзін мой сын таксама працуе дырыжорам аркестра і кампазітарам. Калі яму трэба было вызначыцца з выбарам, то я спрабаваў адгаварыць ад гэтай сферы, таму што прафесія вельмі цяжкая. Ты вучышся шмат гадоў. Пасля навучання многія становяцца выдатнымі музыкантамі, а вось кампазітарамі — мала хто. Выбар такога шляху не гарантуе вам прызнання. Можна шмат пісаць для сябе, але быць ацэненым толькі пасля смерці (як было, напрыклад, у Мендэльсона), нават калі пішаш усё жыццё».

Днямі славуты маэстра адзначыць сваё 85-годдзе. Ён вядомы і любімы сваёй аўдыторыяй. Яму падабаецца футбол і гульня ў шахматы, але музыка застаецца галоўнай у яго жыцці.

**Алена ДРАПКО.**

## ■ Дзе розум?

### ПАСЛЯ СПАЙСУ НЕ ДАЙШОЎ ДА МЕСЦА ВУЧОБЫ

**У сталіцы 16-гадовы навучэнец аднаго з каледжаў пасля ўжывання спайсу страціў прытомнасць літаральна ў некалькіх кроках ад месца вучобы...**

— Хлопец з прыяцелем ужылі псіхатропы да прыходу ў каледж. Калі навучэнец страціў прытомнасць, яго сябра, спужаўшыся, збег. Маладога чалавека, які ляжаў на зямлі, заўважылі мінакі і патэлефанавалі ў службу «103». Пасля аказання экстраннай медыцынскай дапамогі падлетак прыйшоў у прытомнасць, — распавяла прэс-афіцэр Партызанскага РУУС г. Мінска Ганна Чыж-Літаш. — Потым у размове з інспектарам інспекцыі па справах непаўналетніх хлопец пачаў расказваць, што спайс курыў яго сябра, а ён толькі стаяў побач і, відаць, надыхаўся. Аднак медыцынская экспертыза засведчыла, што юнак сам ужываў псіхатроп.

Гэта далёка не першы выпадак, калі пасля спайсу маладыя людзі губляюць прытомнасць. Нядаўна ў дзяжурную часць ноччу паведамілі, што на лесвічнай пляцоўцы без прыкмет жыцця ляжыць хлопец. На першы погляд падалося, што ўжо позна... Галава маладога чалавека ляжала ў ванітах, па колеру скуры твару і цела можна было меркаваць, што ён памёр. Медыкі ўлавілі ўдых і адразу пачалі аказваць экстранную дапамогу. Калі падлетка выносілі з пад'езда, урачы баяліся, што да бальніцы хлопца не давязуць. На шчасце, усё абышлося. Пазней высветлілася, што прыяцелі вырашылі пакурыць спайс. Пасля некалькіх зацяжак аднаму са школьнікаў вельмі рэзка стала дрэнна...

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## Усходні гараскоп на наступны тыдзень

**АВЕН**. Асабліва карысна для кар'ернага росту праяўляць ініцыятыву і ўсяляк дэманстраваць актыўнасць. Можа з'явіцца магчымасць для вандроўкі, якая прынясе новыя знаёмствы, не выключана, што ў тым ліку і рамантычныя. Ёсць рызыка нажыць непрыемнасці дома, паколькі сям'я зачакалася ад вас удзелу і ўвагі. Лепшы дзень для вырашэння сур'ёзных праблем — пятніца.

**ЦЯЛЕЦ**. Не адмаўляйцеся ад запрашэння сяброў, калі такое паступіць. Ваша добрасумленная праца мае ўсе шанцы быць адзначанай прэміяй ці павышэннем. Шмат цікавага і прыемнага абяцаюць знаёмствы з новымі людзьмі і іх арыгінальнымі ідэямі. Важныя справы і сустрэчы пажадана прызначаць на чацвер, магчымыя перспектыўныя прапановы.

**БЛІЗНЯТЫ**. Вас чакаюць важныя і цікавыя падзеі. Улавіце кірунак «ветру перамен», каб максімальна скарыстацца спрыяльным шанцам. Захоўвайце сумленнасць, і тады ніякія чуткі не змогуць пашкодзіць вам. У сярэдзіне тыдня разумны кампраміс з дзелавымі партнёрамі можа прынесці нечаканы прыбытак.

**РАК**. Пажадана суцішыць запал і ўважлівей паставіцца да новых праектаў. Залішні поспех прывядзе толькі да сур'ёзных фінансавых страт. У другой палове тыдня магчыма нейкае супрацьдзеянне вашым планам. Акуратна вядзіце свае справы, часцей райцеся з даверанымі людзьмі і спецыялістамі, паколькі вялікая рызыка памылак.

**ЛЕЎ**. Паспрабуйце не сумнявацца ў сваіх здольнасцях, і ажыццяўленне вашай новай цікавай ідэі будзе ўдалым. Вялікая частка часу можа пайсці на вырашэнне прафесійных задач. Паспрабуйце не забыцца на абяцанні, дадзеныя блізкім людзям. У сярэдзіне тыдня высокая верагоднасць канфліктных сітуацый. Крытычна паглядзіце на праблемы, не звальвайце віну на навакольных.

**ДЗЕВА**. Даволі цяжка будзе абмяркоўваць пытанні ўзаемадзеяння з дзелавымі партнёрамі, бо з вашага боку можа праявіцца яркае імкненне да дамінавання. Паспрабуйце стрымацца. Першая палова тыдня добрая для прагматыкаў, удалымі апынуцца канструктыўныя дзеянні. Падзеі тыдня дазволяць па-новаму ацаніць шмат якія пазіцыі ў асабістай сферы.

**ШАЛІ**. Вось і настае час рашучых дзеянняў. Чакаецца выдатны насычаны тыдзень. У вас будзе практычна ўсё атрымлівацца. Неабходна завяршыць некалькі важных спраў. Шматлікія з ідэй, на якія ў вас ніяк не хапала часу, могуць нарэшце ўвасобіцца ў жыццё. Паспрабуйце дапамагчы ўсім, хто звернецца да вас па падтрымку.

**СКАРПІЁН**. У прафесійных справах запатрабуецца імклівая рэакцыя на змену сітуацыі і ўменне знаходзіць нестандартныя рашэнні. Не варта разлічваць на хуткія вынікі і вялікі прыбытак, спяшацца давядзецца толькі вам — усё астатняе будзе складацца паэтапна. Асабліва разлічваць на дапамогу навакольных цяпер не варта.

**СТРАЛЕЦ**. Самай непрыемнай падзеяй могуць аказацца нападкі нядобразычліўцаў ці неабгрунтаваныя прэтэнзіі далёкіх сваякоў. І тых, і другіх варта ігнараваць. Жыццёва неабходна мець зносіны з прыемнымі вам людзьмі. Давядзецца адстойваць свае інтарэсы без усякай падтрымкі, даверцеся свайму багатаму жыццёваму досведу. Паспрабуйце вылучыць трохі часу для хатняй руціны.

**КАЗЯРОГ**. На гэтым тыдні будуць вымаўлены словы, якія могуць паўплываць на ваш лёс, і тады жыццё зменіцца да лепшага. Усе ідэі, якія прыйдуць у галаву, акажуцца выдатнымі, справа застанецца за малым — увасобіць іх у жыццё. У сераду зоркі зробяць для вас падарунак, так што рыхтуйцеся.

**ВАДАЛЕЙ**. Тыдзень насычаны падзеямі. Вашы планы пачнуць увасабляцца ў жыццё імклівымі тэмпамі. Палепшацца адносіны з навакольнымі, будуць вырашаны практычна ўсе канфліктныя сітуацыі. Можаце разлічваць на падтрымку і дапамогу сяброў і блізкіх. Паспрабуйце і самі нікому не адмаўляць у дапамозе, а таксама выконваць неабходную працу своечасова.

**РЫБЫ**. На вашы плечы можа легчы вялікая адказнасць, не дазваляйце іншым кіраваць вамі, і тады поспех будзе забяспечаны. Пачынаючы з сярэдзіны тыдня, наступіць зручны перыяд для перагляду і змены адносін з калегамі па працы і начальствам, калі гэтыя адносіны маюць патрэбу ў зменах. Будзьце ўзважлівымі, ведайце ва ўсім меру — такая пазіцыя прынясе добры плён. Блізкія людзі падтрымаюць вас у новых пачынаннях.

## Даты | Падзеі | Людзі

***Міжнародны дзень барацьбы з фашызмам і антысемітызмам. У ноч з 9 на 10 лістапада 1938 года адначасова ў Германіі і Аўстрыі пачаліся масавыя яўрэйскія пагромы («Хрустальная ноч»), арганізаваныя кіраўніцтвам нацысцкай партыі.***

**1906** год — з указа ад 9 лістапада пачалася аграрная рэформа Пятра Аркадзьевіча Сталыпіна. Яе стрыжнявой ідэяй было разбурэнне сялянскай абшчыны шляхам дазволу вольнага выхаду з яе любога домаўладальніка. Селянін, які выходзіў з абшчыны, атрымліваў у прыватную ўласнасць усе замацаваныя за ім надзелы, прычым яны павінны быць зведзены ў адзін участак. Указ заахвочваў утварэнне хутарской сялянскай гаспадаркі, не замахваючыся пры гэтым на памешчыцкія землі. Сталыпін лічыў, што супольнае жыццё сялян у вёсках палягчае працу рэвалюцыянерам. А вось сялян, разгрупаваных па хутарах, занятых сваёй гаспадаркай, будзе вельмі цяжка падымаць на бунт. Сацыяльны ж сэнс аграрнай рэформы заключаўся ў тым, каб стварыць шырокі пласт дробных буржуазных уласнікаў, якія з'яўляюцца асноўным фактарам палітычнай стабільнасці грамадства.



**1902** год — нарадзіўся (вёска Вешкі, цяпер Докшыцкі раён Віцебскай вобласці) Нестар Фёдаравіч Сакалоўскі, беларускі кампазітар, хормайстар, фальклрыст. З 1926 года — акцёр і хормайстар БДТ-3. У 1937-41 гадах — адзін з арганізатараў і хормайстар Ансамбля беларускай народнай песні і танца Беларускай філармоніі. З 1943 года — мастацкі кіраўнік Палескага абласнога ансамбля песні і танца, з 1946-га — у Белдзяржвыдавецтве. Аўтар музыкі Дзяржаўнага гімна БССР (словы М. Клімковіча), хароў, песень на вершы Я. Купалы, Я. Коласа, П. Броўкі, А. Русака, інструментальных мініяцюр, вакальных сюіт на тэмы беларускіх народных песень, апрацовак беларускіх народных песень (больш за 500) і найгрышаў. Памёр у 1950 годзе.

**1960** год — 43-гадовы Джон Фіцджэральд Кенэдзі быў абраны прэзідэнтам Злучаных Штатаў. Перадвыбарнай кампаніяй кіраваў яго малодшы брат Роберт. Сумнаму прагматызму рэспубліканцаў, якіх прадстаўляў Рычард Ніксан, дэмакраты супрацьпаставілі рамантычны энтузіязм. І гэта спрацавала. Не прапануючы выразнай праграмы, Кенэдзі заклікаў амерыканцаў зрабіць «прарыў да новых межаў». Пра амерыканцаў Кенэдзі казаў, што «яны заплацяць любую цану, вытрымаюць любыя цяжкасці, падтрымаюць адзін аднаго і змогуць супрацьстаяць любому саперніку». Кенэдзі стаяў ля руля дзяржавы ўсяго два гады і дзесяць месяцаў. Яму не ўдалося выканаць да канца свае абяцанні па зніжэнні падаткаў і рэарганізацыі сацыяльнага страхавання. Знешняя палітыка таксама была не надта ўдалай: правалілася аперацыя па звяржэнні Фідэля Кастра на Кубе, ЗША пачалі ўвязацца у канфлікце паміж Поўначчу і Поўднем В'етнама, а пры вырашэнні Карыбскага крызісу давялося пайсці на саступкі Хрушчову і закрыць базы ў Турцыі. Тым не менш многія гісторыкі называюць кароткую эпоху Кенэдзі «імперскім прэзідэнцтвам», лічачы, што амерыканцы ставіліся да прэзідэнта, як да любімага манарха. Гэта быў, мабыць, самы абаяльны і шчыры прэзідэнт Амерыкі. Цікава, што, нягледзячы на супрацьстаянне Хрушчова і Кенэдзі, пахаванне прэзідэнта ЗША, забітага 22 лістапада 1963 года ў Даласе, паказвалі па савецкім тэлебачанні гэтак жа падрабязна, як пазней пахаванні генеральных сакратароў ЦК КПСС.

### Было сказана

**Аляксандр ЕЛЬСКІ, пісьменнік, этнограф, гісторык:**

***«Калі народ любіць і ўшаноўвае песняй сваё гняздо, ужо гэта адно добра аб ім сведчыць».***


Ад імя ўсіх кіраўнікоў сельгаспрадпрыемстваў раёна віншую **старшыню праўлення СВК «Востраў-Агра» Уладзіміра Іванавіча Мароза з 60-годдзем.** Ваш дзень нараджэння, шаноўны калега, прыпадае на глыбокую восень. І ўсё ж у гэты юбілейны дзень хацелася б пажадаць вясновага настрою, святочнай утульнасці і шмат самых жаданых гасцей з найлепшымі пажаданнямі і памятнымі падарункамі, аптымізму, здароўя і даўгалецця.



**Уладзімір Віктаравіч ПЯТРОЎСКІ,**
**старшыня Ляхавіцкага райаграпрамсаюза.**

УНП 200344612


# ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

### ЧАСТУЙЦЕСЯ!

## «Рафаэлкі» з печані



**Спатрэбіцца:** ***сыр цвёрды — 500 г, яйка курынае — 6 шт., печань ялавічная — 400 г, маянэз (або смятана ці ёгурт натуральны) — 250 г.***

Надзерці на буйной тарцы вараныя печань, яйкі. 200 г сыру — на дробнай тарцы. Усё добра змяшаць з маянэзам. Соль, перац і зяленіва дадаць на смаку. З пячоначнай масы зляпіць шарыкі і ўкачаць у буйна надзёртым сыры. Патрымаць страву ў халадзільніку 30 хвілін.

## Капуста чырвонакачанная па-чэшску

**Спатрэбіцца:** ***капуста чырвонакачанная — 1 кг, яблык — 3 шт., цыбуля рэпчатая — 1 шт., сок аднаго лімона, кмен — 2 ч. л., соль (на смак) — 1 ч. л., мёд — 3—5 ст. л., алей сланечнікавы — 7 ст. л.***

Шаткуем капусту. Рэжам кубікамі цыбулю. Бярэм вялікую каструлю, наліваем алей, выкладваем цыбулю і трохі абсмажваем. Дадаем капусту. Змешваем і памяншаем агонь. Тушыць будзем на маленькім агні, не накрываючы. Выціскаем сок аднаго лімона. Надзіраем яблыкі без лупіны на буйной тарцы. Дадаем у капусту яблыкі і сок лімона. Тушым на слабым агні, памешваючы, 20 хвілін. Дадаем мёд і соль і тушым яшчэ 20 хвілін. У канцы сыплем кмен і тушым яшчэ 10 хвілін. Усяго капуста тушыцца прыблізна 40-50 хвілін.

## Рулетны пірог з грыбамі і курыцай

**Спатрэбіцца:** ***цеста слоенае бездрагджавое — 1 упакоўка, грыбы (можна шампіньёны) — 400-500 г, грудка курыная — 2 шт., цыбуля рэпчатая (вялікая) — 1 шт., кунжут (для абсыпкі) — 1 ст. л., яйка курынае (для змазкі) — 1 шт.***

Адварваем курыную грудку (з моманту закіпання — 20 хвілін, не больш). Грыбы і цыбулю абсмажваем на патэльні. Дадаем кавалачак сметанковага масла. Рэжам курачку невялікімі кавалачкамі і выкладваем на раскачанае слоенае цеста. Зверху раскладваем абсмажаныя грыбы і закручваем у рулет. Зашчыпваем краі з абодвух бакоў. Змазваем яйкам. Пасыпаем кунжутам. Праколваем нажом у некалькіх месцах. Выпякаем пры тэмпературы 180°С 30-40 хвілін.



-2976-

### ХОЧАЦЕ — ВЕРЦЕ

## Магічныя ўласцівасці посуду

**Пра кожны прадмет, што знаходзіцца на нашых кухнях, можна расказаць шмат цікавага. Нават звычайны посуд, з якога мы ямо, надзелены магічнымі ўласцівасцямі, таму, выбіраючы сабе новыя талеркі, звярніце ўвагу не толькі на якасць, але і на колер, і на форму талерак.**



Менавіта форма посуду можа дадаць вам якасцяў, якіх не хапае, ці, наадварот, значна ўзмацніць тыя ўласцівасці характару, якімі вы ўжо валодаеце. Так, круглы посуд сімвалізуе гармонію, а значыць, дзеліцца з намі толькі добрай энергіяй. Таму ежа, якая ў ім знаходзіцца, засвойваецца значна лепш і прыносіць адчувальную карысць арганізму. Лічыцца, што сурочыць ежу, калі яна ў круглым посудзе, немагчыма.

Квадратны посуд дадае характару чалавека жорсткасці і ўпэўненасці ў сабе, калі, вядома, не хапае гэтых якасцяў. А вось калі ад прыроды чалавек рашучы і схільны да тыраніі, то лепш есці з квадратнага посуду радзей.

Посуд трохкутнай формы правакуе людзей на неабдуманыя словы і ўчынкі. Ён супрацьпаказаны людзям гарачлівым і якія лёгка ўзбуджаюцца. Затое талеркі, кубкі ці чайнікі з вострымі вугламі — наймацнейшы афрадызіяк, так што яны будуць незаменныя для рамантычнай вячэры.

### РАЗУМНЫ ДОМ

## Ракавіна — лічыльнік вады



**Вы калі-небудзь спрабавалі высветліць, колькі вады сцякае ў ракавіну, пакуль вы мыецеся або чысціце зубы? З'явілася прылада, якая падлічвае кожную кроплю вады. Яна ўсталёўваецца пад ракавінай, а наверх выводзіцца нешта накшталт вільгацеадчувальнага дысплея.**

Для даведкі цікавая статыстыка аб выкарыстанні намі вады:

За хвіліну з крана выліваецца каля 6 літраў вады. Калі чалавек прымае ванну, то расходуе 100-150 літраў вады, а калі абмяжуецца душам — то толькі 30-80 літраў. А калі яе спыніць падчас намыльвання рук, то выдаткуецца ўдвая менш. Калі чысціш зубы, лепш выкарыстоўваць шклянку з вадой, таму што інакш за 3 хвіліны знікне 18-20 літраў. Калі пры мыцці посуду з крана пастаянна льецца вада, траціцца ад 20 да 70 літраў. А ў выпадку, калі ў вас ёсць сад і агарод, які вы вельмі любіце і які трэба будзе летам паліваць, выдатна мець ёмістасць, дзе будзе назапашвацца дажджавая вада, а потым выкарыстоўваць яе.

-2977-

## СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 8.25 | 17.21 | 8.56 |
| Віцебск — | 8.20 | 17.06 | 8.46 |
| Магілёў — | 8.15 | 17.11 | 8.56 |
| Гомель — | 8.07 | 17.13 | 9.06 |
| Гродна — | 8.40 | 17.37 | 8.57 |
| Брэст — | 8.35 | 17.43 | 9.08 |

### Месяц

***Першая квадра 10 лістапада. Месяц у сузор'і Вадалея.***

### Імяніны

***Пр.*** *Аляксандры, Елізаветы, Капіталіны, Андрэя, Марка, Несцера.*
***К.*** *Аляксандра, Анатоля, Людвіка, Тодара, Урсына.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

**Унук (вучань 2-га класа) на два тыдні быў пакінуты разам з бабуляй. Напрыканцы гэтага тэрміну бабуля зразумела, што, калі яна гуляла з Сярожам у школу, то спраўна выконвала яго хатнія заданні.**

Муж кажа жонцы:
— Прывітанне, дарагая, у мяне для цябе сюрпрызы!..
— Праўда? І які ж?
— Я набыў тур у Аўстралію!
— Выдатна! І колькі гадзін туды ляцець?
— Я дакладна не ведаю, але як толькі я туды прылячу, я табе патэлефаную.




caricatura.ru


ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), В. КЛЮЧНІК (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, С. ПРОТАС (першы намеснік дырэктара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

НАШ АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 21, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by



Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.



Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 22.704. Індэкс 63850. Зак. № 4869.

| | | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| М | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
| П | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |

Нумар падпісаны ў 19.30 8 лістапада 2013 года.